Гвязда і калядка ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Пра Беларусь ☞ 12

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 04 (2854) Год LVI | Беласток, 23 студзеня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

ГАЙНАЎКА — ЦЭНТР КАЛЯДАВАННЯ

У гэтым годзе Гайнаўка ізноў стала адным з галоўных цэнтраў калядавання на Падляшшы, калі ўзяць пад увагу колькасць калядных мерапрыемстваў арганізаваных у гэтым прыпушчанскім горадзе, колькасць выканаўцаў калядных абрадаў на сцэне Гайнаўскага дома культуры, а таксама разнароднасць прэзентаваных калядак, абрадаў і даўніх святочных традыцый. На Фестывалі „Гайнаўскія сустрэчы з праваслаўнай калядкай", які з 11 па 16 студзеня праходзіў у ГДК, выступілі 32 калектывы і хары, а ў іх каля 650 выканаўцаў. Сярод іх былі дашкольнікі і вучні, харысты праваслаўных прыходаў і калектывы культурных установаў Гайнаўскага і Бельскага паветаў, а таксама госць — хор з Беларусі. Раней, у час асобнага мерапрыемства, калядкі спявалі гайнаўскія католікі, а 30 студзеня ў Гайнаўцы адбудуцца XXVI Ваяводскія сустрэчы калядных калектываў, у час якіх будуць выступаць, між іншым, нашы беларускія калектывы, якія раней праходзяць адбор да гэтага мерапрыемства. Побач праваслаўных каляднікаў выступяць каталіцкія калектывы, прадстаўнікі ад розных паветаў Падляшскага ваяводства, якія пакажуць характэрныя для іх рэгіёнаў калядныя абрады. Калядаванне дашкольнікаў і ў галоўным вучняў сталі арганізаваць у Гайнаўскім белліцэі з 1998 года, а з 2003 года Гайнаўскія сустрэчы з праваслаўнай калядкай ладзяцца ў ГДК.

Хаця многія калядныя мерапрыемствы арганізуюцца ў Гайнаўцы, толькі адно мае конкурсны характар — гэта Фестываль „Гайнаўскія сустрэчы з праваслаўнай калядкай", які апошнім часам ладзіцца ў міжнароднай кампаніі. Вялікай колькасці каляднікаў мерапрыемства спадарожнічае адносна высокі ўзровень спеву. У гэтым годзе прыбыў з Беларусі Узорны дзіцячы хор „Світанак" Дзіцячай школы мастацтваў імя Рыгора Шырмы з Пружан, які ўжо выступаў у Гайнаўцы тры гады таму. Дзеткі ўдала выступілі з калядкамі на розных мовах і разам з настаўніцамі радаваліся, што вельмі цёпла ўспрыняла іх гайнаўская публіка.

— У цэлым, мы з духоўнымі творамі часцей выступаем, чым са свецкімі песнямі, — сказала апякун і дырыжор пружанскага хору Ірына Буланькова. — Мы ў сябе на вечарынах выступалі з песнямі і абрадамі спалучанымі з Ражджаством Хрыстовым, Вялікаднем ці са святкаваннем Пакровы Божай Маці. Ужо таксама прынята, што ходзім калядаваць да настаўнікаў нашай школы, што жывуць у Пружанах.

Дашкольнікам, якія пачыналі мерапрыемства, на сцэне дапамагалі настаўніцы. За адвагу, шчырасць і займальнае дзіцячае калядаванне дашкольнікі атрымлівалі гарачыя апладысменты. Асабліва цікавымі ў іх выкананні былі ўступныя словы, калі дзеткі прасілі дазволу калядаваць. Дзеткі і частка старэйшых выканаўцаў спявалі са звёздачкамі, а ўсё калядаванне прыаздоблена было ёлкай і вялікай звяздой. Гучэлі даўнія калядкі, але вучні найахвотней спявалі больш сучасныя калядныя творы, нават у суправаджэнні музычных інструментаў.

— Мы выступім са старэйшымі і больш сучаснымі калядкамі ў аранжацыі на больш галасоў, напрыклад, адну спяваем нават на пяць галасоў. Нашы белгімназісткі вельмі ахвотна спяваюць калядкі, заставаліся на дадатковыя рэпетыцыі перад сённяшнім мерапрыемствам, — сказала перад выступам Анна Вярцінская, апякун беларускага калектыву „Капрыс" з бельскай „Тройкі".

— Мяне наш бацюшка заахвоціў рыхтаваць белліцэістак спяваць калядкі. Мы калядавалі ўжо ў розных месцах, — заявіла апякун калектыву каляднікаў з Бельскага белліцэя Івона Балеста.

Бельскія дзяўчаты ўдала выступілі таксама і ў Гайнаўцы.

— Мы кожны год выступаем з новымі калядкамі. Апошнім часам нам штораз складаней знайсці арыгінальныя і цікавыя калядныя творы. Бачу, што сёння музычны ўзровень калядавання высокі. Каб нашае калядаванне было больш натуральнае, мы спяваем без акампанементу, — сказала Бажэна Ляўчук, апякун гайнаўскай „Знічкі".

— Выступамі на сцэне мы працягваем традыцыю калядавання, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне. Наша калядаванне багатае з-за яго разнароднасці і спалучэння даўніх традыцый з новымі тэндэнцыямі. Бывае, што паміж каляднікамі завязваюцца сяброўскія сувязі, адбываецца інтэграцыя, перш за ўсё дзетак і моладзі. У гэтым годзе выступілі ў нас таксама новыя вясковыя выканаўцы — царкоўны хор з Сухавольцаў і фальклорны калектыў „Цаглінкі" з Ляўкова, — заявіў дырэктар Дэканальнага інстытута праваслаўнай культуры ў Гайнаўцы, протаіерэй Павел Стэрлінгаў, святар Свята-Троіцкага сабора. Інстытут, разам з аб'яднаннем „Любіцелі царкоўнай музыкі", Грамадскім арганізацыйным камітэтам, Гайнаўскім домам культуры, Брацтвам праваслаўнай моладзі пры Свята-Троіцкім саборы і метадыстам навучання праваслаўнай рэлігіі ў Гайнаўцы Ліляй Буслоўскай выступілі арганізатарамі калядных сустрэч. Конкурснае калядаванне ў гэтым годзе праводзілася два дні і распачыналася з выступаў дашкольнікаў. За імі калядавалі вучні і прадстаўнікі іншых катэгорый выканаўцаў, а ўсё мерапрыемства закончылася гала-канцэртам, у час якога выступілі пераможцы, якім уручаліся ўзнагароды. Яшчэ ў час конкурсных выступаў усе выканаўцы атрымалі дыпломы, а кожны каляднік — падарунак. Спонсарамі конкурсу былі прадпрыемствы, установы і вернікі Свята-Троіцкага прыхода.

*Конкурсная камісія сярод дашкольнікаў прызначыла першае месца каляднікам з **Непублічнага прадшколля імя св. мл. Гаўрыіла ў Бельску-Падляшскім**, другое — **Прадшколлю № 3 у Гайнаўцы**, трэцяе — **Прадшколлю № 1 у Гайнаўцы**, а вылучэнне атрымалі дашкольнікі з **прадшколляў № 2 і № 5 у Гайнаўцы.***

*Сярод вучняў падставовых школ пераможцам стаў калектыў **„Лясная гавэнда" з Комплексу школ у Чыжах**, другое месца заняў **вакальны калектыў з Падставовай школы ў Дубінах**, а трэцяе — **хор з Комплексу школ № 2 у Гайнаўцы**.*

*У групе гімназічных і звышгімназічных школ два першыя раўнапраўныя месцы занялі калектыў **„Вянок" з бельскай „Тройкі"** і калектыў **„Знічка" з Гайнаўскага белліцэя**, другое месца камісія прысвоіла калектыву **„Капрыс" з бельскай „Тройкі"**, а трэція раўнапраўныя месцы занялі **вакальны калектыў з Бельскага белліцэя і калектыў „Мелодас" з Комплексу прафесійных школ у Гайнаўцы**.*

*У катэгорыі іншых груп каляднікаў першае месца занялі **хор „Світанак" з Пружан** і калектыў каляднікаў з **Гімназіі № 2 у Бельску-Падляшскім**, другое — **фальклорны калектыў „Цаглінкі" з Ляўкова і моладзь са „Студыі эстраднай песні" Гайнаўскага дома культуры**, а трэцяе — **калектыў „Джэрэла" Саюза ўкраінцаў Падляшша.***

*Сярод прыхадскіх хароў перамог маладзёжны **хор Свята-Троіцкага сабора ў Гайнаўцы**, другое месца заняў **хор Прачысценскага прыхода ў Бельску-Падляшскім**, а трэцяе месца камісія прызначыла **харам Дзмітрыеўскага прыхода і парафіі Нараджэння св. Іаана Хрысціцеля ў Гайнаўцы**.*

А што далей?

Прайшло чатыры тыдні пасля таго, як старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі агучыла вынікі прэзідэнцкіх выбараў на Беларусі. І ўсе гэтыя чатыры тыдні, не зважаючы на навагоднія і калядныя святы, па ўсёй краіне праходзілі вышукі, допыты, выклікі. Дзяржаўная машына запрацавала ў звышузмоцненым рэжыме. Пачалі выносіцца папярэджанні тым нешматлікім грамадскім арганізацыям, якім яшчэ ўдалося дажыць да гэтага часу ў афіцыйна зарэгістраваным статусе. Спецслужбы ўзмоцнена запрацавалі над раскрыццём нейкай таямнічай змовы, у якую нібыта ўцягнутая калі не ўся, то вельмі вялікая частка нацыі. Дзяржаўныя газеты і тэлебачанне, не дачакаўшыся рашэння суда і нават вынікаў следства, ужо паказалі беларускаму грамадству вінаватых у падзеях 19 снежня. Складваецца ўражанне, што дзяржаўныя структуры ведаюць толькі адно, што яны мусяць нешта рабіць. Але не ўяўляюць, што канкрэтна яны зрабіць павінны.

Не абышлося і без абвінавачванняў у адрас іншаземных краін. Аказваецца, па версіі афіцыйнай беларускай прэсы, у гэтую таямнічую змову ўцягнуты ледзь не ўвесь цывілізаваны свет. І немцы, і палякі, і нават рускія. Як кажуць у народзе — і жук, і жаба. Вось толькі адно застаецца сапраўды таямніцай: чаго ўсе гэтыя змоўшчыкі хацелі ад Беларусі? Чым наша краіна не дагадзіла далёкім і блізкім суседзям, і нават сваім грамадзянам? Дзе матывы такой негатыўнай увагі да нас? На гэтыя пытанні аўтары раскрывальных тэкстаў не адказваюць. Яны такіх пытанняў нават не падымаюць.

А яшчэ больш дзіўным падаецца тое, што аж да саміх выбараў аніякія дзяржаўныя структуры Беларусі не змаглі выкрыць такой вялікай змовы. У Беларусі дастаткова спецслужбаў, якія не толькі могуць, але і мусяць не дапускаць такіх рэчаў. Чаму яны перад выбарамі не давялі да грамадства, што не толькі замежныя дзяржавы, але і кандыдаты на галоўную пасаду ў краіне, іх паплечнікі, сябры штабоў і кіраўнікі палітычных партый, і нават журналісты ў нечым там замешаныя? Чаму гэтая інфармацыя прайшла з недапушчальным спазненнем?

А што ж Еўропа? Еўропа ў стане вострага шоку, які ледзь не перайшоў у кому. Еўропа не ведае, што рабіць. Зноў увесці санкцыі? Але ж гэта ўжо было. І нічога з гэтага не атрымалася. Гэтак жа, як нічога не атрымалася з палітыкі саступак і залагоджвання. Цяпер разглядаецца варыянт надзвычай жорсткіх санкцый. Што гэта такое, хутка ўбачым. Пакуль што пра гэта, як падаецца, не ведаюць нават самі дэпутаты Еўрапарламента.

Незразумелую і надзвычай асцярожную пазіцыю заняла Расія. Здаецца, яна таксама ў шоку. У шоку ад таго, што яна атрымлівае ад гэтай сітуацыі зусім нечаканыя бонусы. Зараз, як бы не мянялася сітуацыя ў Беларусі, гэта ўсё на карысць Расіі. Калі Захад разарве адносіны з цяперашняй беларускай уладай, гэта для Крамля не тое што радасць, але нават шчасце. Колькі змагаліся за тое, каб Масква адзіная мела ўплыў на Беларусь, а гэта само як з неба звалілася. Калі ж Еўропа надумаецца пагандляваць, зноў без Расіі, як пасрэдніка, не абыдзецца. У Крамлі гэта разумеюць і, як здаецца, не могуць вызначыцца са сваімі паводзінамі, каб абраць найбольш выгадны курс. Хоць па вельмі скупых выказваннях відаць, што Расія нібыта пагаджаецца з рашэннямі Еўропы ў дачыненні да сённяшняй беларускай улады.

І ўсе зараз, і Еўропа, і Расія, і беларуская апазіцыя, і беларускія спецслужбы задаюць сабе адно рытарычнае пытанне: а што далей? Апазіцыю разграміць для ўлады справа простая і хуткая. Але ж гэта запуск механізма самазнішчэння. І запушчаны механізм спыніць ужо будзе немажліва. Хто пасля апазіцыі першым трапіць пад гэтыя жорны, якія будуць раскручвацца ўсё хутчэй і біць усё больш балюча? Як паказваюць урокі гісторыі, нават зусім нядаўняй, гэты механізм самазнішчэння распраўляецца з усімі, у тым ліку і з тымі, хто яго запусціў. З кожным разам ён б'е ўсё больш моцна, і ўжо нават не арыентуецца ў тым, для чаго і супраць каго ён створаны. І сёння трэба маліцца менавіта за тое, каб гэты механізм самазнішчэння нацыі не запрацаваў. Выправіць наступствы яго дзейнасці будзе надзвычай цяжка.

Віктар САЗОНАЎ

Няпросты 2010 год (3)

Кончылася даволі актыўная прэзідэнцкая выбарчая кампанія. Выбары адбыліся ў двух турах у канцы другой дэкады чэрвеня і на пачатку ліпеня. Ужо ад самога пачатку выбарчай кампаніі было вядома, што нашым прэзідэнтам будзе або Браніслаў Камароўскі, або Яраслаў Качынскі. Яны, канешне, розныя людзі, але ўжо іх партыі, а значыць і іх праграмы не надта адрозніваюцца паміж сабою, бо выраслі гэтыя партыі з аднаго супольнага кораня. А гэта ў сваю чаргу значыць што і Камароўскі, і Качынскі гэта, як кажуць, аднаго поля ягадкі. Такія ягадкі, канешне, не ўсім падабаюцца. І калі такія людзі ішлі галасаваць, то аддавалі свае галасы не на партыі і не на іх праграмы, а на канкрэтную асобу. Такія галасаванні, даволі модныя цяпер у нас, маюць ужо сваю назву — галасаванне за меншае зло.

Чаму ў многіх нашых грамадзян такі недавер да найвышэйшых улад? Канешне, па прычыне стану і кандыцыі нашай гаспадаркі і краіны. Больш дваццаці гадоў ужо капіталістычна-рыначныя ўлады і партыі ўсё перабудоўвалі і перабудоўваюць нашу гаспадарку і краіну, але штосьці выразных эфектаў і дабрабыту не відаць. Так крытыкаваную калісьці задоўжанасць краіны яны не толькі не ліквідавалі, а ў некалькі разоў павялічылі яе. Ухітрыліся таксама зрабіць пагражаючую бюджэтную дзірку. А ўсё ж такі можна было адно ліквідаваць, а да другога не дапусціць. Яны атрымалі ў спадчыну ад народнай улады немалое народнае багацце, якога павінна было хапіць і на адно, і на другое, і на трэцяе, каб толькі новыя ўлады кампетэнтна, адказна і чэсна гаспадарылі ім. На жаль, такімі прыметамі не ўсе новыя правячыя каманды могуць пахваліцца. І сталася тое, што сталася. Народнае багацце абы-як распрадалося, раздалося, растрацілася, расплылося, абанкруцілася, а даўгі і дзіркі разрасліся.

Непатрэбна ўлезлі мы ў Ірак і Афганістан. Гэта задарагое, закрывавае і, што не кажы, грэшнае мерапрыемства, а мы ж, падобна, такія набожныя, што гатовы на сярэдзіне вуліцы ставіць крыжы. Аказваецца, што наша слаўная і баявая армія не толькі ваюе, але і на наш немалы кошт будуе там дарогі, школы, капае студні, а таксама перакупляе розных шэйхаў і талібскіх ватажкаў, каб яны не чапалі нашых войск. Афганцы, канешне, усё ахвотна прымаюць і пры кожнай нагодзе вельмі ахвотна забіваюць сваіх спонсараў... Дзе ж тут сэнс і дзе логіка?! Новы прэзідэнт абяцаў, што дзесьці з 2012 года пачнем памаленьку выводзіць адтуль нашы войскі. А паколькі вайну лягчэй распачаць, як яе закончыць, дык можна сумнявацца ў прэзідэнцкіх абяцанках.

У прэзідэнцкіх выбарах я таксама ўдзельнічаў і аддаў свой голас на Браніслава Камароўскага. І кіраваўся тут не толькі меншым злом, а і паходжаннем яго. Усё сваё дарослае жыццё я і мы на найвышэйшыя дзяржаўныя пасады выбіралі заўсёды прадстаўнікоў рабоча-сялянскага паходжання ці працоўнай інтэлігенцыі — і, між намі кажучы, ненайлепей на гэтым выходзілі. Давай, думаю, папробуем выбраць арыстакрата — і не нейкага прыдуманага на халяву, а самага сапраўднага, патомнага, блакітнакроўнага графа.

Наступнай важнай і шырока вядомай падзеяй на Падляшшы з'явіўся плач Божай Маці Скорапаслушніцы на іконе, якая знаходзіцца цяпер у царкве святога апостала Іаана ў Тарэспалі. Падзея гэта незвычайная, устрывожыла яна людзей. Народ перакананы, што Багародзіца заплакала не без прычыны — штосьці азначаюць яе слёзы. І людзі проста губляюцца ў дагадках: што Прасвятая Дзева хоча сказаць нам? Можа каб не гублялі мы сваёй чалавечнасці, не пакідалі святой веры нашай, не перасталі быць праваслаўнымі?..

Магла быць тут і іншая прычына. Ікона гэтая была прывезена з праваслаўнай Украіны, дзе калісьці таксама працвітала багатае праваслаўнае жыццё і глыбокая праваслаўная вера тамашніх людзей. І што асталося з таго? Толькі „kikuty" адны. І як тут не заплакаць?!.

Самаўрадавыя выбары прайшлі ў нас даволі спакойна, ціха. Трэба сказаць, што цяперашнія выбары розняцца ад колішніх, яшчэ з часоў Народнай Польшчы. Там было многа медыйнай шуміхі, урадавай агітацыі, празмернай сур'ёзнасці і абавязковасці, хаця вынікі выбараў былі вядомыя яшчэ далёка перад выбарамі. Цяпер таксама перадвыбарчай шуміхі многа, але робяць яе ўжо самі кандыдаты, іх паплечнікі і партыі. І вынікі да канца невядомыя. Пра многіх кандыдатаў цяпер наслухаешся такога, што аж зарагатаць хочацца. І адразу ціснуцца ў галаву коласаўскія радкі: „Сказаць: салгаў — не выпадае, паверыць — веры не хапае".

Гэта і ёсць дэмакратыя і плюралізм...

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

У абарону вязняў

У час канферэнцыі „Ваеннае становішча ў Беларусі? Як да гэтага дайшло і што далей?", якая адбылася ў польскім Сейме, дзеячы беларускіх дэмакратычных сіл і сем'і ахвяр палітычных рэпрэсій у Беларусі, між іншым, арыштаваных, звярнуліся з заклікам да польскіх улад. Напісалі ў ім м.інш. „Заклікаем Вас падтрымаць нашае змаганне і павялічыць рэальную дапамогу беларускаму адкрытаму грамадству — ахвярам палітычных рэпрэсій і тым, якія хаваюцца ад пераследу ў Польшчы, незалежным беларускім СМІ, сярод іх вяшчаючым з тэрыторыі РП, а таксама беларускім дэмакратычным партыям, грамадскім рухам і праваабарончым арганізацыям, якія супраціўляюцца дзяржаўнаму тэрору ў Беларусі". І далей: „Хочам, каб еўрапейская грамадскасць паслядоўна патрабавала ад улад Беларусі вызвалення палітвязняў. Заклікаем урад Польшчы і Еўрасаюза да салідарнасці з беларускім народам і прымянення ўсіх даступных прыёмаў, прадбачаных у міжнародным праве, між іншым, дыпламатычных, палітычных, эканамічных і іншых санкцый з мэтай прымушэння беларускіх улад да неадкладнага вызвалення палітвязняў".

Калі ў час канферэнцыі быў прыняты заклік, слухаючы гасцей з Беларусі склалася ў мяне ўражанне, што на гэты момант фактычна найважнейшай справай, калі гаворка пра дапамогу дэмакратычнай Беларусі, з'яўляецца справа давядзення да неадкладнага вызвалення палітвязняў і прытым безагаворачна (без шантажу). У гэтым кантэксце прачытаў я рэзалюцыю па Беларусі, прынятую некалькі дзён раней Камісіяй Еўрапарламента. Сам старшыня ЕП Ежы Бузэк заявіў, што беларускія ўлады павінны зняць абвінавачанні з арыштаваных. А выкананне гэтага патрабавання неабходнае, калі Беларусь хоча мець якія-небудзь зносіны з Еўропай. Сярод санкцый прадбачаны ў рэзалюцыі забарона ўезду і замарожанне фінансавых актываў беларускіх чыноўнікаў, якія ангажаваліся ў крывавае падаўленне дэманстрацыі 19 снежня. Іх адмяненне павінна залежаць ад вызвалення ўсіх лідараў апазіцыі, затрыманых у сувязі з гэтымі падзеямі. Пакуль невядома, якога ўзроўню чыноўнікаў мелі б тыя санкцыі датычыць (ці таксама суддзяў, дэканаў вышэйшых навучальных устаноў, якія адлічаюць студэнтаў, функцыянераў КДБ, збіваючых дэманстрантаў дубінкамі?) і мае сумненні выклікае факт пастаўлення ультыматуму выключна маючы на ўвазе лідараў апазіцыі. Ці меншыя ганенні і рэпрэсіі перажылі сотні іншых арыштаваных і іх сем'і?

Сярод іншых санкцый ЕП пералічаны: павелічэнне фінансавай падтрымкі для беларускага адкрытага грамадства (незалежным СМІ і няўрадавым арганізацыям), павелічэнне фінансавай дапамогі і назначэнне стыпендыяў беларускім студэнтам, адлічаным з беларускіх вучэльняў за ўдзел у мірных пратэстах, паніжэнне аплат за візы грамадзянам Беларусі, а нават іх адмяненне для студэнтаў, навукоўцаў і мастакоў ды перагляд стану міжпарламенцкіх стасункаў з Беларуссю, між іншым, у рамках Парламенцкай асамблеі Усходняга партнёрства (Еўранест). Цяпер застаецца чакаць рэзалюцыі, якую прыме польскі парламент. Калі пішу гэтыя словы, абмяркоўваецца яна ў клубах. Гаворка пра тое, каб ніхто не сумняваўся ў тым, што пазіцыя ўсіх палітычных сіл у Польшчы наконт снежаньскіх падзей і іх пасляслядоўнасцей у Беларусі з'яўляецца адназначнай. Мяркую прытым, што якраз справа палітвязняў і іх сем'яў павінна быць там пастаўлена цвёрда.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

„Цаглінкі” са Старога Ляўкова

Дуэт „Зараніца” з Крынак

Тэатр „Антракт” з Бельска-Падляшскага

Падляшская капэла з Сямятыч

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Трынаццатыя прэзентацыі калектываў „Гвязда і калядка” 16 студзеня 2011 года сабралі залу поўную з берагамі ў Гарнізонным клубе ў Беластоку па вуліцы Кавалерыйскай. Можна сказаць, што беларускае каляднае мерапрыемства, аранізаванае БГКТ пры падтрымцы падляшскага ваяводскага самаўрада, міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі і Культурнага цэнтра Беларусі пры пасольстве РБ, з'яўляецца першым сёлетнім беларускім фэстам і аглядам найлепшых калектываў роднай песні. І на чатырохгадзінным аглядзе паслухалі і пабачылі мы беларускія калектывы ад Сямятыч да Крынак, ад малечаў-дашкольнікаў да заслужаных для беларускай культуры калектываў, адзначыўшых дзесяцігоддзі дзейнасці. А было што і пабачыць — спевакі хвалілі Нованароджанага Госпада з каляднымі зоркамі, традыцыйнымі ці больш стылізаванымі, большасць у строях як сапраўды ішоўшы шчадраваць па вечаровай вясковай вуліцы. З найменшых спевакоў захапілі гурт з Самаўрадавага садка № 14 у Беластоку, калектыў Студыі аўтэнтычнай музыкі „АБ-БА”, калектыў Вясковага дома культуры ў Рыбалах і „Антракт” з Бельска-Падляшскага. Выступілі вялікія калектывы „Крыніца” і „Каласкі” з Беластока, „Асенні ліст” з Гарадка, „Рэха пушчы” з Гайнаўкі, „Куранты” і „Васілёчкі” з Бельска, „Цаглінкі” са Старога Ляўкова, „Арляне” і „Чыжавяне”, прадстаўніцтвы калектываў „Каліна” з Залук, „Малінак” з Маліннік, „Журавінак” з Агароднічак у Супрасльскай гміне, „Згодных макаў” з Райска, „Крыўчанак” з Крыўца, „Каліны” з Дашоў, „Рэчанькі” з Козлікаў, „Луны” з Парцава, калектыву з Дабрывады, „Расспяванага Гарадка”, „Навіны” з Машчонай-Каралеўскай ды Падляшская капэла з Маркам Скамароўскім з Сямятыч. Маладым духам павеяла ад „Вэрвачак” з Орлі, гурту з Белавежы, сямейнага трыо з Макаўкі, дуэту „Зараніца” з Крынак. Гучалі калядныя песні на стараславянскай, рускай, беларускай і ўкраінскай мовах з рознымі варыянтамі гаворак. Кожны хваліў Нованароджанага Госпада па-свойму, з талентам, на радасць слухачам, якія таксама спявалі.

Анёлкі з калектыву АБ-БА сярод гледачоў

Сямейнае трыо з Макаўкі

Калектыў Вясковага дома культуры ў Рыбалах

Самаўрадавы садок н-р 14 у Беластоку

Калектыў Студыі аўтэнтычнай музыкі „АБ-БА”

Дзіцячы калектыў Вясковага дома культуры ў Рыбалах

„Збучанкі” са Збуча

Зіма ў Ляўкове

Зараз снегу хоць адбаўляй. У Новым Ляўкове (Нараўчанская гміна) снег з новапракладзенага тратурара згартае ўсяго дзесяць гаспадароў. Па тратуары не прайсці. Я па ім перабіраўся ад пачатку да канца вёскі. Вялікія гурбы снегу ляжаць на прыпынку ПКС у Новым Ляўкове. За прыпынкі адказная гмінная ўлада, але з іх боку няма ніякага руху. Адзін з аднасяльчан сказаў мне, што тратуар павінен расчышчаць радны (зараз новаабраны Павел Несцярук) і солтыс. Іх выбралі і яны павінны старацца.

Снег ляжыць на тратуары, а новаляўкоўцы з сама менш 20 двароў яго не адкідваюць у равы або на гурбу пад плотам. Не бяруцца за лапату і мятлу. Каб можна было хадзіць па тратуары, не клапоцяцца людзі, якія з'ехалі ў Варшаву, Беласток ці Гайнаўку, або якім пад 90 гадоў. Па-мойму, да некаторых з тых, хто тут яшчэ пражывае і не адснежвае, павінна завітаць паліцыя.

Вярнуся я да мінулай снежнай зімы. Тады ў Новым Ляўкове тратуар (ён тут па адным баку вуліцы) быў расчышчаны. Да гаспадароў часта заходзіў радны папярэдняй кадэнцыі і заклікаў выходзіць з лапатай. Сам ён першы даваў прыклад іншым. Калі ўжо хто пастаянна замятаў тратуар насупраць свайго дома, ён уручаў узнагароду — бярозавы венік.

Дашкі, якія нікому не служаць

Ёсць такія надстрэшкі на аўтобусных прыпынках ПКС пры рухлівай ваяводскай дарозе з Міхалова ў Юшкаў Груд. Стаяць яны, між іншым, у Імшары і ў Баршчэве-Юльянцы. Першы з іх, той у Імшары-Леўшуках, знаходзіцца ў зарасніках на тамашніх тарфяніках. Тут здаўна не спыняюцца аўтобусы ПКС. Другі пабудавалі ў Юльянцы на ўзгорку ды яшчэ і на павароце. Ужо шмат гадоў тут не тармазіць ні адзін рэйсавы пасажырскі аўтобус ПКС. На белай сцяне прыпынка вялікімі літарамі напісалі „Przeniesiony". Вось такія дарожныя абсурды.

Варта дадаць, што 30-40 гадоў таму віяты-дашкі будавалі з тоўстых пустакоў. Стаяць яны быццам бункеры і прастаяць яшчэ з паўвека. Хто ведае, можа занясуць іх у спісак помнікаў даўніны?

(яц)

АБ'ЯВЫ

З цыкла: Размовы аб... літаратуры

ІГНАТ КАРПОВІЧ

(пісьменнік, перакладчык, падарожнік)

21.01.2011 (пятніца), гадз. 17:00

Запрашаем

Цэнтр прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка"

Гайнаўка, вул. Т. Саланевіч, 2

Пётр Бароўскі, Ася Чабан і Надзея Алекша

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

КАНЕЦ ПЕСНІ — ПАЧАТАК РАЗМОВЫ!

Не памятаю ўжо калі апошні раз была я на такой сустрэчы. Больш за гадзіну крынкаўскія хлопцы корпаліся ля камп'ютара, які шмат разоў даваў збоі і нельга было яго ўключыць. На дапамогу ім прызвалі местачковых тэхнікаў. На здаровы розум людзі павінны знерваваць і разысціся кожны ў свой бок. А тут — не! У час змагання з тэхнікай ў памяшканне бібліятэкі заходзілі ўсё новыя і нечаканыя людзі. Прыйшлі героі фільма, сямейка з малымі дзеткамі, моладзь, войт Шудзялаўскай гміны, пенсіянеры, Сакрат Яновіч, журналісты... Сярод публікі вылучалася прыгажуня з дрэдамі на галаве і крынкаўскі маладзён з татуіроўкай на шыі і вушах. Гаспадынькі Ася Чабан і Галена Пухальская з аб'яднання „Тэра Інкогніта" рабілі ўсё каб не сарваць сустрэчы. Калядавалі, частавалі свойскімі пірагамі і каўбасой, гарбатай... Раней, у час Каляд, паехалі калядаваць па сваіх вёсках — Піражках, Востраве, Азяранах, Белагорцах... Закалядавалі на местачковае свята. Тое, што адбылося вечарам у суботу 15 студзеня г.г., запамятаюць усе, хто прыйшоў. Запамятаюць па-рознаму: адны з сентыментам будуць думаць пра фільм Пятра Бароўскага „Канец песні" і ўспамінаць мінулае, іншым запомніцца палымяная спрэчка, якую ў канцы прэзентацыі выклікаў Сакрат Яновіч. Спрачаліся, як гэта заведзена ў апошні час у Крынках, за беларускую мову! Але пра гэта пасля, у канцы...

* * *

— О, гэта Баравік з Гаркавіч! А тая — кабета з Сукавіч, няма яе, памерла ўжо, — каментуе ўголас старажылка Надзея Алекша з Піражкоў. Бабульку пасадзілі ў першым радзе, каб усё бачыла і чула. Жанчына не выступіла ў фільме з-за хваробы, але, як адзначыў рэжысёр, была для яго натхненнем і крыніцай. Пані Надзея падспеўвала разам з героямі, голасна шкадавала, калі тыя абрывалі прыгожую песню пасля другой страфы, каментавала словы знаёмых герояў. У пэўны момант здалося мне, што фільмавыя кадры быццам зніклі, людзі з экрана і на публіцы сустрэліся, аб'ядналіся, загаварылі. Адны гледачы падспеўвалі, іншыя смяяліся, хтосьці плакаў. Быццам склалі працяг тых самых герояў, якія гаварылі і спявалі з экрана. Такія пірагі!

— Я тады з сям'ёй жыў у Астраўку, — успамінае зіму 1980/1981 гадоў Ян Чабан. Яму, як настаўніку, даручалі весці турбазу ў школьным будынку. Там менавіта цягам двух тыдняў кватаравалі акцёры. Хадзілі яны па навакольных вёсках і паказвалі свой паэтычны спектакль „Ужо адыходзім". Людзі, каб аддзячыць ім, спявалі свае песні, якія рэжысёр Пятро Бароўскі запісаў на магнітафонную плёнку. Пасля гадоў вярнуўся і зняў фільм пра спадчыну, якая не дачакалася працягу. Ян Чабан, народны разьбяр, краязнавец і чалавек-„аркестр", іграў для іх на гармоніку, на бубнах. У фільме гучаць яго мелодыі, паказаны ягоны ветлівы партрэт.

— Пятро Бароўскі ўспамінае вас з асаблівай сімпатыяй. Расскажыце, чым такім прыслужыліся Вы рэжысёру і яго фільму?

— Бо там былі і іншыя клопаты, — кажа спадар Чабан. — Сярод іх быў чужаземец, які часта прыкідваўся „карабінерам". Прыехала міліцыя і пытае ці не шпіёны якія скрываюцца за „арцістамі"? Тут, у памежнай зоне заўсёды сачылі з падвойнай увагай, насцярожанасцю.

— І чым гэта ўсё скончылася?

— Усё разышлося кругамі па вадзе, — смяецца мой субяседнік. — Бо, ведаеце, тым міліцыянтам, які прыехаў высветліць іх становішча і арыштаваць, быў мой брат!

Легендарны паход групы Пятра Бароўскага, які пасля спрычыніўся да ўзнікнення фільма, здзейсніўся напярэдадні ваеннага становішча.

* * *

Пра культавы фільм Пятра Бароўскага „Канец песні" мы пісалі ўжо шмат разоў, але, як прыкмеціў сам рэжысёр, нават для яго самога заўсёды пры чарговай прэзентацыі адкрываецца нешта новае.

— Я думаў, што толькі на Беласточчыне гэты фільм будзе належна зразумелым, — кажа, — тым часам праблема адмірання духовай спадчыны зразумелая і ў Паўднёвай Амерыцы, і ў Швецыі, і ў Закапаным. Людзі гавораць адно: у нас таксама ўжо так не спяваюць! Ідзе пра духовую і эмацыйную нагрузку, закладзеную ў песню. Разам са спевамі людзі вялі з сабой ціхую гутарку пра каханне, смерць, здраду, вайну, жыццё... У іх адчуваецца паэзія, штосьці самае цэннае, няўлоўнае....

— А колькі разоў „Канец песні" глядзелі на Беласточчыне?

Мой субяседнік пачаў лічыць усе прэзентацыі ў нашым куточку: у Саколцы, у Дуброве-Беластоцкай, два разы ў Беластоку, два разы ў Белавежы, у Ляўкове (на Сустрэчах „Зоркі"), у Сынкаўцах... А зараз дзевяты раз у Крынках. Чаму, нягледзячы на поўныя рукі работы, прыняў запрашэнне? (Арганізатары вярнулі толькі кошт падарожжа публічным транспартам; дарэчы, каб здабыць сродкі, самі паехалі калядаваць па вёсках). Крынкаўская зямля займае сардэчнае месца ў яго душы. У васьмідзесятыя гады Пятро сябраваў з Паўлам Валошыным з Вершаліна. Сёння, калі ехаў, думаў пра адышоўшага ўжо ў лепшы свет прыяцеля. Павел Валошын навучыў яго не прыдзірацца да жыццёвых параз.

— Раз, калі я адчуваў сябе вельмі нешчаслівым, — успамінае Бароўскі, — і, здавалася, што ўжо няма мне дарогі ў жыцці, я паехаў у Вершалін, каб запытаць у Паўла пра сэнс у жыцці. „Няма ніякага сэнсу!" — адказаў мне тады прыяцель. І замест размовы прапанаваў прагулку на сваім самаробным „самаходзе" па наваколлі. Калі мы селі ў машыну і ён завёў рухавік, грукнула так, што ўсе вароны паўцякалі з лесу. Мы ехалі на гэтай грукатлівай машынцы і я адчуваў як усе мае разважанні пра „сэнсы" пачалі ўцякаць разам з тымі варонамі... Вось які гэта быў прыяцель!

* * *

Я сама ўжо чацвёрты раз пабывала на прэзентацыі „Канца песні". Кожная сустрэча з рэжысёрам гэта нагода для гутарак пра духовую спадчыну. У падобным, хоць не лірычным настроі, выступіў пісьменнік Сакрат Яновіч. Ён пахваліў фільм за дыялогі з людзьмі і пакрытыкаваў за „няведанне мясцовай спецыфікі".

— Амаль усе песні ў фільме на расейскай мове. Яны не маюць нічога супольнага з нашай зямлёй і культурай. Яны паказваюць як перааграў нашы душы расейскі імперыялізм. А вам, — звярнуўся да Пятра Бароўскага, — трэба навучыцца беларускай мовы!

Сам рэжысёр успрыняў увагі з належным паклонам, аднак крынкаўская публіка не даравала. Адны ў атмасферы скандалу пакінулі залу, іншыя даказвалі, што ў іх няма ніякай беларускай мовы, а толькі нейкая мешаніна ўсяго з усім, якую папросту завуць простай мовай! Такім чынам адазваўся крынкаўскі „труп у шафе", дзе ўжо гадамі ніяк не даецца наладзіць у школе сапраўдных урокаў беларускай мовы.

Разлучыла нас мяжа — хай аб'яднае дружба

Дзмітравічы

Я ўжо стаю на парозе Вечнасці і таму не магу, не маю права забраць з сабой тое, што ведаю, знайшоў у дакументах, што чуў ад неабыякавых людзей, чэрпаў з іх успамінаў.

Г. Мусевіч

Тут, у Дзмітравічах, 11 лістапада 1931 года ў сям'і настаўніка спеваў і музыкі Сцяпана Сцяпанавіча Мусевіча нарадзіўся сын Георгій. Скончыўшы ў Дзмітравічах першы клас польскай школы, ён два гады хадзіў у пачатковую рускую школу. У 1941 годзе сям'я пераехала ў Камянец. Выхаваннем хлопчыка займалася бабуля Марыя Палікарпаўна Елінецкая — уладальніца ўласнай бібліятэкі, што складалася з пяці тысяч рэдкіх кніг. Менавіта яна заахвоціла ўнука чытаннем з чатырохгадовага ўзросту.

Пасля заканчэння ў пасляваенны час Камянецкай сярэдняй школы Георгій Сцяпанавіч паступіў у Інстытут фізічнай культуры ў Мінску. Атрымаўшы дыплом, ён працуе выкладчыкам фізкультуры ў Высокаўскай сярэдняй школе. А калі ў будынку былой сінагогі ў Высокім адкрылі спартыўную школу (1959 год), узначаліў яе і працяглы час быў нязменным дырэктарам.

Мы, вучні, вельмі любілі і паважалі свайго трэнера, а захапленне спортам для абсалютнай большасці з нас набыло зайздросныя маштабы. Больш таго: спартыўная школа стала для вучняў другім домам. Строгі і патрабавальны настаўнік адразу заваяваў аўтарытэт сваімі адносінамі да работы і да падапечных.

50 год прайшло з моманту майго заканчэння школы, але і дагэтуль памяць утрымлівае ўсё, што адбывалася тут: спаборніцтвы, спартакіяды, кросы, камандныя сустрэчы з равеснікамі з іншых гарадоў, навагоднія святы і трэніроўкі кожны дзень. Паслабленняў не было ніколі, бо ведалі: толькі ўпартая праца забяспечыць перамогу. Вынікі часта радавалі: раслі чэмпіёны, прызёры і проста фізічна загартаваныя юнакі і дзяўчаты, улюбёныя ў спорт. Кожны з нас, атрымаўшы такую падрыхтоўку, мог смела выкладаць фізкультуру ў школе альбо быць трэнерам на аматарскім узроўні.

Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа (ДЮСШ) „Пушча" пяць разоў станавілася пераможцай у спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы ў вобласці. І, як вынік, стала лепшай у Беларусі сярод раённых спартыўных школ.

З 1990 года Георгій Сцяпанавіч шмат часу праводзіць за пішучай машынкай, сістэматызуючы сабраны матэрыял аб Камянеччыне і яе людзях, аб сівой даўніне, аб стасунках, якія існавалі на памежных землях. Вынікам карпатлівай працы сталі тры кнігі і 500 артыкулаў. Апошняя кніга „Народ, который жил среди нас" выйшла ў 2009 годзе і стала сапраўднай сенсацыяй. Яна аб яўрэях, што жылі ў Камянцы і ваколіцах.

У 2007 годзе часопіс „Па-суседску", 10 нумароў якога выпусціў Беларускі форум у Гайнаўцы, надрукаваў польскі варыянт кнігі Георгія Мусевіча „Жыццё і смерць апошняга караля Польшчы".

У зборнік легендаў „Забытых таямніцаў чар" пад рэдакцыяй Наталлі Герасімюк увайшлі 9 паданняў аб Камянеччыне, напісаных у розныя часы неўтаймоўным краязнаўцам.

І сёння Георгій Сцяпанавіч у актыўным творчым пошуку. Лёгкі на пад'ём, шчыры на гутарку, добразычлівы ў адносінах да людзей, ён валодае ведамі, здабытымі ў архівах, у спецыяльнай літаратуры, у старажытных фаліянтах, у гутарках з дасведчанымі людзьмі.

Сябруе з Дарафеем Фіёнікам з Бельска, падтрымлівае сувязь з айцом Рыгорам Сасной з Рыбалаў, перапісваецца з цікавымі людзьмі з Аргенціны і Канады, з Англіі і Украіны, з Польшчы і Беларусі. Прымае актыўны ўдзел і ў духоўным жыцці Камянца.

Часты госць раённай бібліятэкі імя Усевалада Ігнатоўскага, Георгій Сцяпанавіч удзельнічае ў розных мерапрыемствах, што праходзяць тут. Яго парады і прапановы вельмі карысныя для чытачоў усіх узроставых груп.

Тамара ЛАЎРАНЧУК

Самааддданы і самаахвярны чалавек

Канстанціна Майсеню ўспамінае гайнаўскі мастак Віктар Кабац.



Фота Міры ЛУКШЫ

Лёс вельмі часта зводзіць людзей выпадкова, раптоўна, неспадзявана. Такім чынам сустрэў я на сваёй дарозе Канстанціна Майсеню.

Сядзелі мы з Антонам Семенюком, Аляксандрам Баршчэўскім і Сакратам Яновічам у цёмным памяшканні Саюза польскіх настаўнікаў па вуліцы Баторыя ў Гайнаўцы і абмяркоўвалі літаратурную сустрэчу ў белліцэі, якой мела спадарожнічаць выстава карцін Анатоля Корзуна і маіх. Нашу размову перарвала рыпенне дзвярэй. Увайшоў высокі, чарнявы, прыстойны мужчына. Прывітаўся беларускім „добры дзень", падаў руку і адразу перавёў размову на іншую тэму. „Хлопцы, — сказаў, — робім беларускі музей у Белавежы. Трэба хутка сарганізаваць экспазіцыю. Няма што дыскутаваць". Гэта было маё першае спатканне з Майсенем. І я з вялікай адданасцю ўключыўся ў музейную справу. Праўда, на яго заклік людзі адгукнуліся неадкладна і некалькі дзён пазней работа пайшла поўным ходам. Маланкава і невядома адкуль узяліся неабходныя матэрыялы. Хачу прыгадаць, што тады з матэрыяламі было дрэнна, цяжка было іх здабыць. Але для Канстанціна Майсені не была гэта непераадольная перашкода. Меў ён своеасаблівы дар пераконвання людзей, з'ядноўвання іх вакол справы, мабілізацыі да ажыццяўлення планаў і намераў. Спакойная, рашучая настойлівасць, бескарыслівасць дапамагалі яму ў здзяйсненні ягоных задум.

На вялікі жаль, Рэгіянальны беларускі этнаграфічны музей у Белавежы доўга не праіснаваў (працаваў у 1966-1972 гадах у будынку па вул. Вашкевіча, 54), а сабраныя экспанаты рассеяліся па іншых музеях. Але Канстанцін Майсеня не здаўся. Думаў, планаваў, абмяркоўваў ідэю новага беларускага музея, цалкам прафесійнага, надалей праводзіў акцыю збору экспанатаў.

Мая другая сустрэча з Майсенем адбылася ўжо ў новым будынку музея ў Гайнаўцы, які праектаваў мой брат Ян Кабац. Будова музейнага комплексу была тады справай надта рызыкоўнай і патрабавала вялікай адданасці, самаахвярнасці. Хаця Канстанціну Майсеню дапамагалі людзі згуртаваныя ў Грамадскім камітэце пабудовы беларускага музея, але гэта ён нёс адказнасць за ўсю інвестыцыю. Яшчэ вяліся аддзелачныя работы, а ўжо пачала дзейнічаць бібліятэка. Майсеня запрапанаваў спалучыць працу бібліятэкі з невялікай галерэяй. Я падтрымаў гэтую ідэю. Хутка былі выкананы стэлажы і неўзабаве сталі ладзіцца першыя выстаўкі.

Высока цаню сваё супрацоўніцтва з Канстанцінам Майсенем. Ён заразіў мяне любоўю да беларускай народнай культуры, якой я тады яшчэ не цікавіўся. Думаю, што гэта быў выключны чалавек. Аднак ён не ацэнены належным чынам нашымі дзеячамі. Таксама справа маецца з самім музеем, які ён будаваў з такой адданасцю, з думкай пра беларусаў усяго свету.

Ілюзорнай мне здаецца дзейнасць сённяшняга згуртавання, якое кіруе музеем у Гайнаўцы. Напрыклад, не прымае яно ў свае рады людзей ахвотных дапамагчы музею, гатовых з ім супрацоўнічаць. Чаму сённяшняе кіраўніцтва музея не хоча пакарыстацца дапамогай кампетэнтных і прафесійна падрыхтаваных людзей для мяне застаецца незразумелай справай. Музеем павінен кіраваць самааддданы і самаахвярны чалавек — такі, якім быў Канстанцін Майсеня.

Запісаў Віктар БУРА

Кур'ёз у секцыі

25 лістапада 2010 года ў бібліятэцы Дома настаўніка ў Гайнаўцы адбылася сустрэча з паэтэсай Аннай Крот з Гайнаўкі. На аўтарскую сустрэчу запрасілі кіраўнічка педагагічнай бібліятэкі Ірэна Пракапюк і старшыня гайнаўскай секцыі настаўнікаў-пенсіянераў пры Аддзеле Саюза польскіх настаўнікаў (СПН) Ірэна Юрчук.

На сустрэчу прыехалі і мы з жонкай аўтобусам ПКС з Новага Ляўкова. На імпрэзе толькі мы былі з г.зв. глыбінкі. Дадам, што я з'яўляюся раўнапраўным і шматгадовым членам СПН ды секцыі настаўнікаў-пенсіянераў. І нават ужо запрапанавалі аўтарскую сустрэчу са мною ў студзені 2011 года.

13 снежня 2010 года ў размове па тэлефоне са старшынёй секцыі І. Юрчук я пачуў, што я дрэнна раблю, бо навошта 25 лістапада прыйшоў з жонкай. Праўду кажучы, я быў ашарашаны і аслупянеў. У чым жа справа? Чаму ж на аўтарскай сустрэчы нельга быць з жонкай? Не чуў, што ёсць такі закон, які забараняе. А тут жа старшыня дадала, каб я больш не прыходзіў з жонкай на ніводнае мерапрыемства, якія ладзіць секцыя. 16 снежня была запрапанавана аплаткавая сустрэча. „Што за самавольства ў хіба такой адзінай секцыі", — падумалася мне.

Хачу дадаць, што мая жанчына ні ў чым невінавата. Яна не гарбатая, не крывая і не дурнаватая (прабач, жонка!). Вяла сябе падчас сустрэчы прыстойна, ціха і спакойна. Раз, а мо два чхнула. Здараецца ж. Стаялі мы ў Ляўкове на аўтобусным прыпынку і даймаў пранізлівы вецер. Напэўна мая жонка не чхала на мерапрыемства, якое было ўдалае і ўсім спадабалася. І прайшло яно паспяхова, вельмі ўрачыста і ў цёплай сяброўскай атмасферы. Не частавалі гарбатай ці кавай. Дык арганізатары не патрацілі на нас, маю на ўвазе сябе і жонку, ні залатоўкі. Дык у чым справа? Імпрэзу арганізавала перш за ўсё кіраўнічка бібліятэкі. А „буру" зрабіла мне старшыня секцыі. Не пачуваюся я да ніякай віны. Аўтарскія сустрэчы паўсюдна адкрыты для ўсіх. А вось з такой секцыяй мне не па дарозе. Яе члены хай сабе варацца ва ўласным соўсе.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

На пасёлку Пяста

Неаднойчы прыходзіцца мне наведваць дачку на пасёлку Пяста ў Беластоку. У пачатку студзеня, калі ішоў з аўтобуснага прыпынку лініі № 5, на тратуары перад жылым корпусам „Г" прыкмеціў шмат кавалкаў хлеба. Валяліся проста пад нагамі. Цяжка сказаць, хто іх выкінуў — дарослыя ці дзеці. Факт застаецца фактам. Дрэнна гэта сведчыць аб людзях. Жанчына, з якой я завёў гаворку на гэтую тэму, сказала: «Калі праходжу пад вокнамі жылых карпусоў, дык азіраюся, каб нешта згары на галаву не ўпала. Усяго можна спадзявацца». Значыць, не адзіны гэта выпадак, які прыкмеціў я перад корпусам „Г". Перад іншымі такое ж таксама здараецца.

Верыць не хочацца, што людзі ў цяперашнім часе так неразважліва абыходзяцца з хлебам. Гэта негуманна выкідаць хлеб у сметніцу або, як у гэтым выпадку, проста, пад ногі, каб тапталі людзі. У народзе кажуць: «Як нас бачаць, так аб нас пішуць». Варта аб гэтым памятаць, паважаныя жыхары пасёлка Пяста!

(ус)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Святы вечар, добры вечар...

На календары 11 студзеня, калядны вечар у беластоцкіх „Сподках". Для кожнай сямейкі падрыхтаваны салодкі стол. За імі мамы, бацькі, цёткі, бабулі, сябры. Трэба падтрымаць малечаў у час выступленняў! Пасярэдзіне залы гуляюць непаседы, якім за годзік. Тыя, што ў садку, для іх — „вялікія", а кожная невядомая цётка здаецца добрай настаўніцай. Міхалінка ахвотна дае мне ручку і мы шпацыруем нейкі час па паркеце. Да нас падбягае хлопчык:

— Гэта мая сястра! — кажа.

— Ці будзеце сёння калядаваць разам з сястрычкай?

— Не, толькі я і мой тата, — інфармуе мяне дашкольнік і бяжыць пагуляць з аднагодкамі...

Цікава! Звычайна з дзеткамі, якія як агонь ірвуцца на сцэну, выступаюць родныя. Спявае дачушка або сынок, мама дапамагае, тата трымае ў руках зорку. Часам выступаюць дзве-тры сямейкі. Ім больш адважна ў кампаніі, больш смела.

— Сёння ў нас аж дваццаць калядніка́ў, — кажа Альжбета Рудчук, сімпатычная намеснік дырэктара польска-беларускага садка ў Беластоку.

Ужо чарговы год запар калядаванне тут наладжанае такім чынам, што выступаюць дзеці з бацькамі, сваякамі, часам іх успамагаюць знаёмыя. Усе перажываюць, рыхтуюцца...

Яшчэ да таго, як сямейкі выйшлі да мікрафонаў і закалядавалі, мы разам з сябрамі гадалі ўголас: *Цікава, колькі разоў прагучыць „Учора з вячора"*.

Гэтая калядка ў апошні час наздзіў папулярная. У мінулым годзе, напрыклад, яна паўтарылася столькі разоў, што аж пераелася. Ад калядніка́ў заўсёды патрабавалі разнавідных і новых калядак.

— Мы абачліва падпыталі дзяцей пра рэпертуар, — кажа спадарыня дырэктар. — На шчасце, песні рэдка паўтараліся.

Некаторыя групы, як аказалася на сцэне, у адзін момант былі здольныя праспяваць любую калядку. Вось што сказаў нам Адам Паўлоўскі, бацька Нікі і Віктара, які калядаваў з сем'ямі Здрайкоўскіх, Чыквіных, Чыжэўскіх і Сцепанюкоў:

— Спачатку мы разгубіліся. Якраз перад нашым выступленнем іншыя праспявалі нашу калядку „Ой, на моры, моры". Трэба было ратавацца. Дык рашылі дадаткова праспяваць народную калядку з Грабаўца (са зборніка падляшскага фальклору „Як выскочыў верабей).

Вынаходлівы выбар спадабаўся людзям у зале. Іх запамяталі і падарылі ім бурныя апладысменты. Калі гаварыць пра новыя калядкі, то найбольш спадабаліся Кандрат і Зміцер Косціны. Праўда, іх калядкі былі самыя старыя. Яны проста прыгожа праспявалі калядку і шчадроўку з усходняй Беларусі з характэрным запяваннем. Інакш, амаль па-манастырску, спявалі Аня Пятроўская і яе сёстры (Садоўскія). А маленькая Каліса ды Дарка, наперакор маме і цёткам, спявалі сваю мелодыю. Цудоўна выступілі таксама Ганна і Павел Васькоўскія з дачушкай і сынком. Спадарыня Кася Клімюк выступіла з сястрой ды татам. Бацюшка Васіль Літвінюк спецыяльна прыехаў з Сямятыч, каб падтрымаць сваіх дачок і ўнучанят. І самае галоўнае: добра, што не было ніякіх конкурсаў! Кожны, хто выступіў, адчуваў сябе важным і адважным. Крыху мяшалі мікрафоны, якія не дазвалялі зладзіцца маленькім і дарослым галасам. Праўда, былі выпадкі, калі маладыя і старыя спявалі роўна і кранальна, так як Ала і Наталька Харужыя, якія праспявалі натхнёную калядку беларускага кампазітара Кастуся Кіслага „Святы вечар".

Сапраўды, вечар у „Сподках", дзе сабралася за сотня народу, быў светлым і прыгожым.

ЗОРКА,
фота Ганны КАНДРАЦЮК

Зміцер і Кандрат Косціны

Літвінюкі і Клімюкі

Чыквіны, Сцепанюкі, Чыжэўскія, Здрайкоўскія і Паўлоўскія

Сям'я Васькоўскіх

Аня Пятроўская з дачушкамі і сёстрамі

Каханне і смерць!

(легенда з Мексікі)

Калі трапіце ў Мехіка, адну з самых вялікіх метраполій свету, складзецца ўражанне, што вы апынуліся ў сярэдзіне мегапярсцёнка. З кожнага боку далягляд горада закрываюць горы. Сярод іх адразу пазнаеце вяршыні Істаксіуатль і Папакатэпетль. Гэта жывыя вулканы. Карэнныя жыхары Мексікі кажуць, што першая гара ўяўляе сабою спячую дзяўчыну, другая — гэта хлопец, што ўкленчыў ля ног сваёй каханай і згарае-„дыміць" ад сардэчнай пакуты. Пасля раскажуць вам страсную легенду пра іх нешчаслівае каханне. Паслухайце!

Даўным-даўно, яшчэ да наезду іспанцаў, горадам кіраваў вялікі ўладар і чараўнік у адной асобе. У яго была дачка, прыгажуня Істаксіуатль. Ужо ад калыскі разглядаліся за адпаведным мужам для прынцэсы з боскага роду. Тым часам, калі Істаксіуатль дарасла, яна закахалася ў храбрым дружыннику, які ахоўваў іх палац-хорам. Хлапец таксама ўсім сэрцам пакахаў дзяўчыну. Нейкі час ніхто не здагадваўся пра іх каханне. Іх тайну ведалі адно сонца і вецер.

Аднак кароль-чараўнік знюхаў пра іх сакрэтнае і нежаданае ім пачуццё. Ён паклікаў маладзёна да сябе і сказаў:

— Калі пераможаш суседняе племя, тады Істаксіуатль пойдзе за цябе замуж!

Ваяр Папакатэпетль нізка пакланіўся вяльможу і разам з войскам пачаў рыхтавацца ў паход. Перад ад'ездам ён расказаў каханай пра план караля. Істаксіуатль паабяцала дзень і ноч маліцца за яго шчаслівае вяртанне. Тым часам кароль меў свой хітры план. Ён спецыяльна выправіў маладзёна ў паход, каб пасля некалькіх дзён хтосьці з даверaных слуг вярнуўся ў палац і паведаміў усіх пра смерць Папакатэпетля. У гэты час прынцэсу мелі пасватаць і аддаць замуж за багатага жаніха з боскага роду. Ніхто не прадбачыў і не прадчуў няшчасця.

Калі ў палац з'явіўся пасланец з весткай пра „смерць будучага мужа", прынцэса ўпала на зямлю і памерла ад жалю. Ашуканы ваяр лётам сокала вярнуўся з дружынай у двор, але там не было ўжо чаго ратаваць. Ён укленчыў ля мёртвай каханкі і памёр ад роспачы. Людзі кажуць, што пасля смерці ваяра яго душа выйшла з цела і пачала „дымець". На гэтым месцы вокамгненна выраслі вулканы, пра якія мы сказалі на пачатку легенды. Вось якая прыгожая гісторыя аздабляе горад-метраплію, аколеную пярсцёнкам з дымячым „вочкам" і спячай дзяўчынай.

ЗОРКА

Музыка з кайфам

„Tlusta Lusta" хлеба

Ці здараецца вам яшчэ на вёсцы ў бабулі атрымаць у якасці закускі лусту хлеба з маслам і цукрам або соллю? Ведаю, нават цяпер, калі на вёсцы няма крамы, прыедзе аўталаўка і прывязе чыпсы і батончыкі. Пытанне дрэнна пастаўленае. Але ўявіце сабе, што напэўна частка вашых бацькоў ласункам лічыла дэсерт у выглядзе хлеба з цукрам (часам пашмараванага не маслам, толькі вадой!). Пачынаю з такой сентыментальнай вандроўкі, бо падобны матыў паяўляецца ў аўтабіяграфічнай, кароткай гісторыі гурту „Tlusta Lusta", які стане сёння нашым героем.

Да гісторыі свайго ўзнікнення члены гурту падыходзяць з прасякнутым іроніяй жартам. А іранізуюць перш за ўсё з беларускай рэчаіснасці, якую маладым чытачам „Зоркі" пэўна цяжка сабе ўявіць. Аднак у гэтым скрываецца мудрасць гродзенскага гурту, бо не адракаюцца, бо ангажуюцца, бо цікавяцца. Штуршком для таго, каб напісаць сёння якраз пра іх, не была міні-аўтабіяграфія. Не стала прычынай памяць пра іх поспех на фестывалі „Басовішча-2008". Уразіў мяне э-мейл ад лідара гурту, які я атрымала пасля выбарчых падзей у Мінску 19 снежня мінулага года, калі ўзброеная ўлада выпрабавала свае магчымасці на безабаронных людзях, якія мірна дэманстравалі сваё незадавальненне вынікам выбараў. Пасля жорсткіх падзей у сталіцы гродзенцы з гурту „Tlusta Lusta" падаслалі мне дзве новыя песні, якія звяртаюць увагу на несправядлівы лёс зняволеных, асабліва маладых людзей. З такой інспірацыі ўзніклі песні „Моладзь" і „Душа". Гэта паказвае, што сёння музыка гэта не толькі конкурс і спаборніцтва, але заангажаванасць і адказнасць, асабліва за слова. Калі будзеце слухаць любую песню, не забудзьце ўслухацца ў яе змест. Не заўсёды сутнасць песні ў прыгожай мелодыі.

Ого, забылася я распавесці пра сам гурт „Tlusta Lusta", а так прыемна, вакацыйна распачаўся расказ. Нічога. Да гурту, абяцаю, яшчэ вернемся, можа нават у выглядзе інтэрв'ю.

i_basovka@o2.pl

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Юліта Данільчук (V „д" клас Комплексу школ з беларускай мовай навучання № 3 у Бельску-Падляшскім).

2. Твой любімы прадмет: польская і беларуская мовы.

3. У жыцці хачу стаць: інструктаркай коннай язды.

4. У сяброў цаню: сяброўства.

5. Не люблю: маны.

6. Па-беларуску размаўляю: з бацькам, бабуляй.

7. Кніжка,якая цябе захапіла: „Чорны красун" („Mój Kagу") Анны Сьюэл.

8. Падабаецца табе музыка: поп-музыка.

9. Твае ўлюбёныя стравы: спагеці, запяканкі.

10. Твой любімы спосаб адпачынку: люблю чытаць кніжкі і даглядаць коней.

11. Калі дарасту хачу жыць: у Сувалках або ў Кракаве, бо там жывуць мае цёці, да якіх я люблю ездзіць.

Польска-беларуская крыжаванка № 4

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 52:

Пуп, зіма, зорачка, павук, ом, касілка, прапанова. Суп, лізак, мова, парус, акіян, печ, кок, грамада.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Паўліна Паплаўская, Дарота Артышук, Дыяна Галёнка, Віялета Дработка, Магда Міхалевіч, Магда Марчук, Юліта Данільчук, Кася Дзержаноўская, Эльвіра Андрусевіч** з Бельска-Падляшскага, **Юстына Вакулюк, Крыстыян Грушэўскі** з Арэшкава. Віншуем!



АБ'ЯВЫ

Шчодры вечар добрым людзям
Szczodry wieczar dobrym ludziam

Каму калядкі, каму бліны і аладкі?!

Калядны канцэрт гурту „**Ilo&friends**" і калектыву „**Расспяваны Гарадок**"

„Шчодры вечар добрым людзям"

калектывы запрашаюць на супольнае калядаванне:

Гарадок ГАК, 21.01.2011 а 17.00
Гайнаўка ГДК, 23.01.2011 а 16.00
Бельск-Падляшскі БДК, 30.01.2011 а 16.00

ЗАПРАШАЕМ

Аб'яднанне „Музей малой бацькаўшчыны" ў Студзіводах,
Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання імя Б. Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім,
Фонд „Ікономос"

запрашаюць на

СЯМЕЙНУЮ СУСТРЭЧУ

У праграме:

— прэзентацыя кнігі Чэслава Анджэя Хайнацкага „Назвы кроўнасці і сямейнага сваяцтва ў гаворках жыхароў ваколіц Бельска-Падляшскага";

— прэзентацыя альбома „Песні і музыка Падляшша і Палесся" — прадстаўляе гурт „Жэмэрва" (Студзіводы) ды трыо сёстраў Лук'яновіч (Палессе, Беларусь);

— абрады, песні і танцы з ваколіц Белавежскай пушчы, м.інш. „Гоготуха" — выступленне калектыву „Орліца" з Навіцкавіч к. Камянца (Беларусь);

— прэзентацыя ўдзельнікаў майстар-класаў „Рэгіён славуты традыцыямі";

— пагулянка пад музыку Віктара Касьянюка, Мацея Філіпчука і Дарафея Фіёніка.

Месца: **Беларускі ліцэй у Бельску-Падляшскім, вул. Каперніка, 4.**
Тэрмін: **28 студзеня 2011 г. (пятніца), гадз. 17:00.**

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт Універсітэта ў Беластоку запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

мгр. **Ромуальд Мячкоўскі**

Віленская „Znad Wilii" і парыжская „Kultura"

27 студзеня, пачатак у 17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Тэкст і фота Аляксандр ВЯРБІЦКІ

НЕСМЯРОТНАЯ СМЕРЦЬ ЧЫНОЎНІКА

Białystok, ulica Pogodna, styczeń roku Pańskiego 2011

У хрэстаматыйным апавяданні Антона Чэхава радавы чыноўнік-гаспадарнік Чарвякоў „чихнул" на патыліцу генерала Брызжалава з ведамства тадышняй інфраструктуры. Растрывожаны магчымымі наступствамі гэтага здарэння экзекутар Чарвякоў у два дні памёр ад тае трывогі. Прыводжу я гэты сюжэт, напісаны 128 гадоў таму, да таго ж у царскую эпоху, да таго ж у Расіі, не з увагі для подзвігаў нашага цяперашняга ведамства інфраструктуры, але таму, што той Чарвякоў, як мне здаецца, зусім не памёр, толькі — як і ягоны зямляк Уладзімір Ульянаў — вечна жывы, да таго ж яшчэ — у нашай Найяснейшай...

Набліжаецца вось 65-я гадавіна пагрому праваслаўных жыхароў тадышняга Бельскага павета падпольным спецназаўскім атрадам пад камандаваннем Рамуальда Райса, „Бурага". Да гэтай пары кампенсацыі атрымалі сем'і тых, што пагрому дапусціліся, бо „Буры", як аргументаваў у 1995 годзе варшаўскі вайсковы суд, „walczył o niepodległy byt Polski". „Героі" змагання „o niepodległy byt Polski" замардавалі тады 82 безабаронныя асобы, у тым ліку жыхароў Занёў, Шпакоў, Залешан, Вулькі-Выганоўскай ды трыццаць вазакоў з некалькіх іншых вёсак, наносячы пакінутым у жывых таксама аграмадны матэрыяльны ўрон. Дзесяць гадоў пазней, у 2005 годзе, беластоцкае аддзяленне Інстытута нацыянальнай памяці палічыла „Бурага" віноўным злачынства генацыду. Да гэтай пары, да 2011 года, сем'і ахвяр пагрому ніякіх кампенсацый не атрымалі. Мала таго, урад Рэчы Паспалітай другой паловы 1990-х гадоў, якім кіраваў цяперашні спікер Еўрапарламента Ежы Бузэк, быў персаніфікаваны ў ранейшым Беластоцкім ваяводстве ваяводай Крыстынай Лукашук, якая намагалася як магла перашкодзіць ушанаванню ахвяр іх сямейнікамі. У канцы 2008 года ў Сейме была створана адмысловая камісія для разгляду кампенсацый пакрыўджаным ад гэтага пагрому, аднак тая камісія з моманту яе стварэння „замарозіла" сваю дзейнасць, быццам прызабыла. Складваецца ўражанне, што ўладам вольнай і дэмакратычнай Рэчы Паспалітай да гонару злачынства, характэрнае найбольш азвярэлым таталітарным рэжымам...

Грамадскі камітэт сямейнікаў памардаваных узброеным падполлем накіраваў нядаўна адмысловы адкрыты ліст, адрасуючы яго найважнейшым асобам у дзяржаве, м.інш. прэзідэнту РП, спікерам Сейма і Сената, прэм'еру, лідарам парламенцкіх клубаў. Ліст атрымалі таксама сродкі масавай інфармацыі, у тым ліку і наша рэдакцыя. Пазваніў я тады старшыні Грамадскага камітэта спадару Юзафу Антанюку, каб дакладней разведаць справу. Аднак спадар Антанюк размаўляць адмовіўся, наводзячы мяне на адрасатаў ліста. У ягонай адмове ад гаварыльні відаць адчай, бо ж дагэтуль на ёй і ўсё вяршылася.

Ну, што ж, падаўся я за падказкай. Свядомы таго, што да першых асоб у нашай дзяржаве — першых адрасатаў — не ўдасца мне прабіцца, рашыў я пацікавіцца наконт гэтай справы ў парламентарыяў ад Падляшскага ваяводства. І ў гэтым напрамку я замногага не спадзяваўся, таму кантактаванне з імі пачаў з зацяжкай, з пачаткам новага года. Звяртаўся я не да ўсіх. Не звяртаўся я да прадстаўнікоў Саюза левых дэмакратаў, бо з гэтага боку разлічваю адно на кругленькія фразы. Пасол Ян Камінскі ад Польскай сялянскай бачынкі звязаны з Сувалкамі і ў сваім бюро ў Беластоку рэдка бывае; меў быць аднаго дня, але тады акурат адбываўся тут ваяводскі вельмі важны сеймік і ён там правёў свой час. Пасол Роберт Тышкевіч ад правячай Грамадзянскай платформы, які займаецца беларускімі справамі, быў вельмі заняты, усё ж такі мой запыт у справе, пакінуты ў ягоным бюро, прыхапіў; спадзяюся, што калісь адказ атрымаю.

З паслом Яраславам Зялінскім ад Права і справядлівасці, які ў свой час займаўся меншасцямі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, удалося мне нават пагаварыць па тэлефоне. Пасол пра ліст да старшыні свайго парламенцкага клуба не ведаў, але папрасіў у мяне копію і абяцаў дэталёва пазнаёміцца са справай і дзейсна ёю заняцца. Меў ён быць у Беластоку ў сераду 12 студзеня, аднак на той дзень быў вымушаны паехаць у Варшаву пратэставаць супраць даклада маскоўскага Міждзяржаўнага авіякамітэта пра смаленскую авіякатастрофу. Усё ж такі і ад яго спадзяюся нейкіх некатэгарычна абяцаных крокаў.

Галоўным персанажам згаданай смаленскай катастрофы быў прэзідэнт Лех Качыньскі. Ён жа быў і галоўным заступнікам Музея Варшаўскага паўстання. Гэтыя два трагічныя здарэнні асацыюе не толькі асоба пакойнага прэзідэнта. З майго пункту гледжання абедзве гэтыя падзеі адбыліся таксама паводле аднаго шаблону: na łeb, na szyję, na oślep. А віноўнікамі выніку гэтай мадэлі дзеяння апавяшчаюцца рускія. Кляймо „рускіх" і ў нашых „тутэйшых"; як жа мае да іх падыходзіць „niepodległy byt Polski"?..

Здаецца мне, што польскія парламентарыі ды іншыя абраннікі народа трывожацца не менш чым чыноўнік Чарвякоў. Апасаюцца менавіта яны, каб не „чихнуть" на свайго „генерала Брызжалава", якім у дэмакратычных польскіх умовах з'яўляецца электарат. А той электарат вельмі насцярожаны за „niepodległy byt Polski", асабліва на нашых ксенафабічных рэштках Крэсаў. Ды хто ведае, ці ён не падобны на слаба прыхаваны айсберг, магутны справіцца з любым смельчаком. І нашы чыны, як той экзекутар Чарвякоў, паміраюць гадамі ад страху за свае пасады. Мо акурат ім належыцца галоўная кампенсацыя за такія цяжкія пакуты...

Напісанае застанецца:
Выданне да 70-годдзя Яна Чыквіна

Literatury wschodniosłowiańskie. Z najnowszych badań. Pod redakcją Haliny Twaranowicz, Białystok 2010, ss. 562.

У мінулым годзе Яну Чыквіну — кіраўніку сённяшняй „Белавежы", споўнілася 70 гадоў. Прапаную пазнаёміць чытачоў „Нівы" з надзвычай цікавым выданнем, прысвечаным гэтай падзеі.

Найлепшы падарунак, які можа пажадаць сабе творца — кніга. Менавіта яе атрымаў ад роднай альма-матэр да свайго 70-годдзя прафесар Беластоцкага ўніверсітэта Ян Чыквін — паэт, літаратуразнаўца, перакладчык, рэдактар, грамадскі дзеяч. Грунтоўны, прыгожа, густоўна афармлены, калі прыемна радуе вока вокладка, дзе нічога лішняга, дзе вылучаныя на асобныя старонкі прысвячэнне і светлы фотаздымак з аўтографам юбіляра, дасканала ўкладзены важкі том навейшых літаратуразнаўчых даследаванняў, што закранаюць шырокае кола праблем у розных галінах філалогіі.

Кніга складаецца з трох раздзелаў. Натуральна, што першы прысвечаны рознабаковай працы Яна Чыквіна. Укладальнікі не прапанавалі назвы раздзела. Падаецца, што хораша адлюстроўвала б ягоны змест цытата „Красы староннік надзвычайны" — радок з верша самога паэта, прысвечаны беларускаму эмігранцкаму паэту Масею Сяднёву. Бо якраз гэта — прыхільнасць творцы да высокай Красы ва ўсіх яе іпастасях, адзначаюць даследчыкі і ягонага багатага літаратуразнаўчага набытку, і ягонай паэзіі.

Хто ён, шаноўны прафесар універсітэта спадар Ян Чыквін, найперш — паэт ці літаратуразнаўца? Недарэмна ж гэтае пытанне часта гучыць на сустрэчах з чытачамі. Як у адной асобе гэтак гарманічна спалучаюцца гэтыя, на першы погляд, такія розныя аспекты творчасці-дзейнасці? Укладальнікі тома, прапанаваўшы першым артыкул доктара філалогіі, прафесара Людмілы Сіньковай „З любоўю да Красы: беларусазнаўчыя даследаванні Яна Чыквіна", што прысвечаныя менавіта літаратуразнаўчым даследаванням, відавочна, тым самым акрэслілі прыярытэт навуковай працы. Магчыма, так сталася таму, што выданне гэтае навуковае, можна нават акрэсліць як акадэмічнае. Для мяне ж Ян Чыквін найперш паэт, які стаўся паэтам такога ўзроўню, такой адметнасці дзякуючы таму, што ён літаратуразнаўца.

Людміла Сінькова грунтоўна разгледзела літаральна ўсе літаратуразнаўчыя набыткі Яна Чыквіна, справядліва адзначыўшы напачатку тое, што зрабіў ён дзеля „Белавежы", літаратурнага аб'яднання, якім вось ужо дваццаць гадоў кіруе. Ні адна значная літаратурная з'ява не прайшла па-за ўвагай Яна Чыквіна. *Менавіта чыквінскае канцэптуальнае бачанне творчасці сяброў літаратурнага згуртавання „Белавежа" не як своеасаблівай краёвай самадзейнасці, а як часткі нацыянальна-духоўнага самавыяўлення беларусаў вывела гэтую творчасць на новы этап — ён быў заканамерным, але трэба было, каб хтосьці спецыяльна рупіўся пра ўвасабленне, рэалізацыю гэтай заканамернасці!* (с. 7). Такім рупліўцам, зразумела, і стаў Ян Чыквін, які ўклаў кнігазбораўскі том „Беларускія пісьменнікі Польшчы. Другая палова XX стагоддзя", склаў бібліяграфічны даведнік „Беларуская літаратура Польшчы" (за 1957-1998 гг.). Выданне Бібліятэкі „Белавежы" таксама ягоны клопат, як і рэдагаванне часопіса „Тэрмапілы", добра вядомага і на Беларусі штогодніка.

Поруч з усім гэтым асабліва вартаснымі бачацца літаратурна-крытычныя артыкулы Яна Чыквіна, у якіх створаны выразныя, цікавыя, дакладныя партрэты многіх прадстаўнікоў беларускай літаратуры Польшчы: Георгія Валкавыцкага, Сакрата Яновіча, Юркі Геніюша, Надзеі Артымовіч, Міхася Шаховіча і інш. Ні адна адметная з'ява не абыдзена ўвагай прафесійнага літаратуразнаўцы, што, безумоўна, спрыяе станаўленню і развіццю мастацкіх талентаў.

Такая важная старонка айчыннага літаратуразнаўства, як даследаванне, а па сутнасці, адкрыццё творчасці беларускіх пісьменнікаў-эмігрантаў, бо, на жаль, і гэта мы робім ці не апошнімі, таксама папоўнілася цікавымі працамі Яна Чыквіна, дзе створаны літаратурныя партрэты знакавых постацей літаратурнага замежжа: Наталлі Арсенневай, Масея Сяднёва, Кастуся Акулы, Янкі Юхнаўца. На яшчэ большы жаль, сёння гэтыя даследаванні ў метраполіі амаль перапынены. Працуючы са студэнтамі, заўважаю, з якой цікавасцю ўспрымаюцца імі артыкулы Яна Чыквіна, што закранаюць душы юных літаратуразнаўцаў, бо аўтар умее вылучыць адметнае, асаблівае, часта скарыстоўваючы ў назвах артыкулаў важныя моманты біяграфіі паэтаў, якія адбіліся на іх творчасці. Да прыкладу, эмігранцкі лёс Наталлі Арсенневай зашыфраваны ў назве „Між Рочэстэрам і Вільняй", а нязломны дух Ларысы Геніюш, як і яе лірычнай гераіні — „Зэльвенская непаслушніца". Робячы выснову з гэтай працы, аўтарка артыкула падкрэслівае вельмі важную думку: *...Літаратура беларускай метраполіі і замежжа паслядоўна аналізуецца Я. Чыквіным менавіта як адзіная, нацыянальна выразная, з паходжання еўрапейская* (с. 7). Адзначым, што гэта ў поўнай меры мае дачыненне і да паэзіі белавежцаў.

Літаратуразнаўчыя артыкулы склалі змест дзвюх кніг „Далёкія і блізкія. Беларускія пісьменнікі замежжа" і „Па прызванні і абавязку". Апроч таго, сюды ўвайшлі працы аб некаторых праблемных пытаннях літаратурнага працэсу, між якіх артыкул „Два шляхі развіцця беларускай паэзіі (Максім Багдановіч і Янка Купала)". Яшчэ ў той час, калі гэты артыкул быў змешчаны ў часопісе „Тэрмапілы" ў 2007 годзе, ён прыцягнуў да сябе ўвагу новым поглядам даследчыка на, здавалася б, ужо цалкам зразумелыя рэчы. Абапіраючыся на дакладныя біяграфічныя звесткі, глыбока пранікаючы ў псіхалогію гэтых дзвюх такіх розных знакавых постацей нашаніўскай пары, Ян Чыквін між іншага засяроджваецца на вельмі няпростых стасунках між імі. Як гэта ні парадаксальна, менавіта ўплыў маладзейшага класіка на ўжо вядомага песняра Янку Купалу меў вялікае значэнне. Літаратуразнаўцу ўдалося расчытаць новыя, прыхаваныя сэнсы твораў абодвух паэтаў, даць сваё вытлумачэнне яшчэ адной загадкі нашай літаратуры. Ян Чыквін *бачыць Максіма Кніжніка ў часы нашаніўства як антыпода сацыяльна ангажаваным паэтам, чыя песня традыцыйна „плакала" аб беларуска-сялянскай долі перадусім — асабліва перад тым, што было ахрышчана „дэкадэнцтвам" ды „ўпадніцтвам", а даследчык у тым бачыць безумоўна вышэйшую ступень развіцця нацыянальнага пісьменства, заходнееўрапейскую „адкрытую" мастацкую структуру* (с. 11).

Людмілай Сіньковай звернута належная ўвага і на творчасць-дзейнасць Яна Чыквіна як перакладчыка, якому належыць кніга пераставрэнняў з польскай паэзіі „Лісце срэбнай таполі", куды ўвайшлі творы тых аўтараў, што найбольш блізкія беларускаму паэту. Асэнсоўваючы актуальныя накірункі сучаснай літаратуры, Ян Чыквін падымае праблему перакладаў з польскай мовы, адзначае набыткі тых, каго называе наступнікамі Максіма Танка, які ў гэтай справе зрабіў надзвычай многа. Людміла Сінькова згадвае ў гэтым плане артыкул „Збігнеў Гэрберт па-беларуску (Да праблемы польска-беларускіх перакладаў)". Зазначым дарэчы, што далёка не ўсё вартае з беларускай паэзіі, ды і наогул літаратуры, перакладзена на польскую мову. Не выключэнне тут і творы самога Яна Чыквіна.

З усіх артыкулаў, прысвечаных паэзіі юбіляра, адзначым найперш параўнальна невялікі, але вельмі цікавы артыкул „Мастацкая мадэль свету ў паэзіі Яна Чыквіна" маладой даследчыцы з Гомеля Алы Брадзіхінай, якая не ўпершыню звяртаецца да творчасці белавежца. Гэтым разам прааналізавана адметная вітальная канцэпцыя, створаная паэтам, калі *акрамя дрэваў, каменння, поля, рэчкі, дарогі і інш., у „жыццярэальнасць" паэт уключае і рэчыўна-прадметны свет, „другую прыроду", штучна створаную рукамі чалавека; і духоўна-псіхічныя працэсы і з'явы; і абстрактныя паняцці — прадукт разумовай дзейнасці; і асобныя прыкметы і функцыі матэрыі ці свядомасці* (с. 20).

Адметным не толькі сваім зместам, але і кампазіцыяй атрымаўся артыкул літаратуразнаўцы з Брэста Юрыя Паталкова „Выратавальны боль: спаведніцкая місійнасць паэзіі Яна Чыквіна". Зрэшты, працы гэтага аўтара заўсёды вызначаюцца арыгінальнасцю.

Безумоўна, нельга абмінуць і працы іншых аўтараў: Яўгена Гарадніцкага, Вольгі Шынкарэнкі, Іны Швед, Галіны Тычкі, Анжэлы Мельнікавай, Міколы Мішчанчука... Прыемна было сустрэць у некаторых артыкулах першага раздзела зварот даследчыкаў да прац гарадзенскага літаратуразнаўцы Анатоля Раманчука, якому належыць першая манаграфія па творчасці Яна Чыквіна „Гарыць мая свяча...".

Большасць артыкулаў, што склалі другі раздзел, прысвечана аналізу рускай літаратуры. Аўтары іх, даследчыкі з Беларусі, Польшчы, Расіі, закранаюць розныя праблемы, асвятляюць творчасць прадстаўнікоў вялікай літаратуры розных эпох, розных мастацкіх накірункаў.

Што да трэцяга раздзела, то ён атрымаўся самым насычаным і мнагапланавым, дзе ахоплена творчасць айчынных літаратараў ад лацінамоўных паэтаў, асэнсаванне іх спадчыны беларускімі даследчыкамі (дыскусійны ў некаторых момантах артыкул Сяргея Кавалёва „Ян Вісліцкі ў беларускай культурнай прасторы"), да разгляду паэзіі нашых сучаснікаў. Да прыкладу, назавем артыкул аб творчасці Валерыі Куставай вядомага даследчыка нашай літаратуры з Вялікабрытаніі прафесара Арнольда Макміліна, аўтара некалькіх грунтоўных манаграфій, між якіх „Літаратура беларускага замежжа".

Уладзімір Конан звярнуўся да параўнальна мала вядомай у айчынным літаратуразнаўстве постаці Міхася Міцкевіча, малодшага брата Якуба Коласа, творчасць якога, як і грамадска-культурная дзейнасць амаль не даследаваны. Лёс гэтай яркай асобы таксама звязаны з чужынай. З агляду таго нямногага, што маецца ў нашым літаратуразнаўстве, аўтар і пачынае свой артыкул: *Шматгранная літаратурная, асветная, перакладчыцкая, рэдактарская творчасць, урэшце, царкоўна-прыхадская служба Міхася Міхайлавіча Міцкевіча... яшчэ чакае свайго руплівага даследчыка* (с. 361).

Настаўнік, асветнік, змагар за беларускую школу, які дзейсна супрацьстаяў паланізацыі ў Заходняй Беларусі, з-за чаго страціў працу настаўніка, і распачатай бальшавікамі русіфікацыі — такой актыўнай паўстае перад чытачамі постаць Міхася Міцкевіча. А ў гады вайны, застаўшыся на Радзіме, ён арганізоўваў беларускае школьніцтва, ратаваў ад рэпрэсій сваіх землякоў.

Увага Уладзіміра Конана звернута найперш на літаратурную і публіцыстычную творчасць Міхася Міцкевіча, фармаванне яго светапогляду і эстэтычных густаў. Аналізуючы нават тыя параўнальна нешматлікія творы аўтара, што захаваліся, даследчык прыходзіць да высновы, што Антось Галіна (псеўданім Міхася Міцкевіча) *быў паслядоўнікам нашаніўскай літаратурнай і эстэтычнай традыцыі* (с. 364). Ужо ў першым апавяданні пісьменніка „Як Мікіта бараніў сваіх" прасочваюцца традыцыйныя для нашаніўства матывы раздвоенасці душы беларуса, ягоных няпростых пошукаў у працэсе нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Даследчык адзначае актуальнасць і сёння напісанага Антосем Галінам амаль 90 гадоў таму.

Некаторыя артыкулы трэцяга раздзела прысвечаны разгляду творчасці беларускіх аўтараў у кантэксце сусветнай літаратуры — параўнальна новы накірунак айчыннага літаратуразнаўства, што асабліва актывізаваны апошнім часам. Сярод іншых адзначым працы Аксаны Данільчык і Тамары Тарасавай.

Наогул, кніга, прысвечаная 70-годдзю Яна Чыквіна, атрымалася змястоўнай, цікавай, карыснай, насычанай і прыгожай. Як і чакалася.

Ала Петрушкевіч

СМАКІ КНЫШЫНСКАЙ ПУШЧЫ — ГІСТОРЫЯ ПРАЗ КУЛІНАРЫЮ

Ян Леанчук і Юзаф Марошак прапануюць кнышы з варэннем і мясам

— Захацелася мне вярнуць смак дзяцінства, прызваць колішнюю атмасферу, — сказаў Ян Леанчук, жыхар Лубнік Заблудаўскай гміны, сааўтар з Юзафам Марошкам „Вялікай кнігі кулінарных традыцый Кнышынскай пушчы". Кнігу выдала Лакальная група дзеяння Кнышыская пушча (ЛГДКП). Кніга гісторыка і паэта, хоць „кухарская", не з'яўляецца зборам рэцэптаў. Багатая ў апісанні тутэйшага смакоцця самавітая, шчодра аздобленая кніга, з'яўляецца ключом для спазнання гісторыі рэгіёна.

— „Вялікая кніга" ахоплівае шырэйшы абшар, чым вынікала гэта з межаў сучасных гмін, уваходзячых у склад ЛГДКП, паколькі гэтая тэрыторыя заставалася ў абсягу і ва ўздзеянні значных цэнтраў матэрыяльныяй і кулінарнай культуры — каралеўскага палаца ў Кнышыне, сталовых маёмасцей, значыць Гродзенскай эканоміі ды магнацкага Беластока, — тлумачыць Юзаф Марошак. — Гэта ягелонскае пагранічча спалучала і інтэгравала народы і дзяржаўныя структуры. Утрыманне ў абшары Вялікага Княства Літоўскага дыялектных адрозненняў, разнароднасці каштоўнасцей духовай і матэрыяльнай культуры, аж да сённяшняга дня, сведчыць пра мірнае суіснаванне грамадстваў і інтэграцыйнай ролі, якую выконвала Рэч Паспалітая, складзеная з двух арганізмаў. Узніклая ў XIV-XVIII стагоддзях культура была супольная і сёння да яе спадчыны прызнаюцца ў роўнай ступені палякі, беларусы і літоўцы. Датычыць гэта помнікаў архітэктуры і будаўніцтва, урбаністыкі і планавання краявіду, але і прыгожага пісьменства, гістарычнай традыцыі, музычнай культуры, матэрыяльнай, між іншым, кулінарнай і побытавай.

— Кажуць, што рэгіён Кнышынскай пушчы, таксама як і ўсё нашае тут памежжа, гэта галоўным чынам стравы з бульбы, — прадстаўляла кнігу рэдактарка выдання Іаанна Сакульская. — А бульбяная традыцыя ў нас адносна маладая. Каб апісаць кулінарную спецыфіку рэгіёна, трэба сягнуць да часоў Жыгімонта Аўгуста і каралевы Боны ды італьянскай гародніны, якую яна прывезла з Бары. І Падляшша стаіць на капусце, на агурках...

З кулінарнай гісторыяй спрабаваў справіцца гісторык Юзаф Марошак, а Ян Леанчук акрасіў тэкст літаратурна — вершамі, прозай, смачнымі выімкамі з іншых аўтараў з розных стагоддзяў. Як адзначылі абодва аўтары — з якіх ужо выгляду вынікае замілаванне да апетытнага харчавання — кніга з'яўляецца гістарычным апрацаваннем з перспектывы кухні і стала. Нават назва Кнышынскай пушчы і Кнышына (які сёння ўжо па-за пушчай) узяла пачатак ад кныша — традыцыйнага невялікага круглага піражка з запечанымі ўнутры (або выкладзеным на паверхні, паміж прыўзнятымі краямі) тварагом або іншай начынкай: варэннем або пасыпанай печанай цыбуляй са скваркамі. Кныш быў традыцыйнай стравай хрысціянскіх і яўрэйскіх трызнаў.

— У адносінах да іншых частак Польшчы гэты абшар выразна адрозніваецца ў культурным плане, і відаць гэта таксама ў кулінарыі. Гэта апошні кавалак спадчыны традыцыі Вялікага Княства Літоўскага. Тут мяшаюцца ўплывы літоўцаў, патомкаў яцвягаў, русінаў, палякаў, — адзначыў гісторык. — Да таго даходзяць уплывы татараў і яўрэяў. Напрыклад, зусім па-іншаму калолася свіней. Тут апальвалася жмутамі запаленай саломы, калі ў іншых частках Польшчы парылася кіпнем і скраблося. На яго думку, аніматарамі культуры былі каралеўскія і магнацкія двары, адкуль ішоў прыклад і прапанова. Ян Леанчук затое прывёў смакі з дзяцінства — лубніцкіх аладдзяў, кішкі і бабкі, саланіны.

Вядома, сярод смачных (і прыгожых на здымках!) улюбёных тутэйшых страў — таўканіца з маслам або скваркамі, якая была даспадобы Тадэвушу Касцюшку!

Кнігу пра кулінарыю немагчыма пакуль купіць — увесь тыраж, 2000 экземпляраў, выдрукаваны за еўрасаюзныя сродкі Рэгіянальнай аперацыйнай праграмы — мае быць раздадзены галоўным чынам у рамках прамоцыі рэгіёна. Магчымае будзе камерцыйнае выданне, бо шмат асоб цікавіцца набыццём гэтай цудоўнай (дасведчаны кніжнік Ян Леанчук першы раз меў у руках так дасканалае выданне) кнігі. Ужо сабраны матэрыял для наступнай Вялікай кнігі — пра драўлянае дойлідства абсягу Кнышынскай пушчы і Лакальная група дзеяння Кнышынская пушча шукае грошай на яе друк.

Міра ЛУКША

Сайты, як і арганізацыі, якім яны належаць, перажываюць перыяды станаўлення, развіцця, часам угасання дзейнасці альбо росквіту. Калі сайт мае добра наладжаную падтрымку, то ўсё новае, што да яго далучаецца, з'яўляецца папросту наступным этапам развіцця. Але здараецца, што арганізацыі поўнасцю пераробліваюць свае сайты, змяняючы нават адрас. Вельмі яскрава гэта праявілася на сайце гродзенскага грамадскага аб'яднання „Трэці сектар".

Калісьці, а менавіта ў лістападзе 2005 года, „Ніва" ўжо пісала пра сайт гэтай арганізацыі, які месціўся па адрасе http://sektar.cjb.net. Сёння там няма аніякага „Трэцяга сектара" з тагачаснымі старонкамі і рубрыкамі. Але арганізацыя не засталася без прадстаўніцтва ў віртуальнай рэчаіснасці. І цяпер, каб пазнаёміцца з яе дзейнасцю, трэба заходзіць на сайт, што месціцца па адрасе **http://3sektar.by.**

Даны сайт стаў больш навінным. Добрая частка яго першай старонкі аддадзена пад навінныя паведамленні — яны займаюць большы, левы бок выяўлення. Разам з імі там даюцца і абвесткі. Абвесткі тычацца разнастайных праектаў, якія „Трэці сектар" намераны здзейсніць.

Калі паглядзець на „шапку" першай старонкі, то там заўважым неардынарныя моманты. Так, выйсці на іншыя старонкі, якіх усяго пяць, месцяцца пад назвай сайта і арганізацыі, але выйсце да „Навін" размешчана чамусьці пасяродку, а не першым злева.

Першай на сайце стаіць рубрыка „Бібліятэка". Там змяшчаюцца як асобныя артыкулы, так і зборнікі тэкстаў, датычных грамадскай дзейнасці. З большага яны тычацца, канешне, Беларусі, але тое-сёе з'яўляецца ўніверсальным і можа быць выкарыстана ангажаванымі ў грамадскую працу жыхарамі Падляшша.

Аб тым, чым жа непасрэдна з'яўляецца „Трэці сектар", мы можам даведацца з рубрыкі „Пра нас". Яна стаіць апошняй у пераліку ўсіх старонак, хоць і з'яўляецца насамрэч прэзентацыяй цэлай арганізацыі. „На аснове беларускіх нацыянальных каштоўнасцей развіваем грамадскую актыўнасць сярод розных колаў насельніцтва шляхам інфармацыйнай і адукацыйна-асветніцкай падтрымкі дэмакратычных грамадскіх ініцыятыў", — распавядаюць пра сябе актывісты „Трэцяга сектара". Там жа падаюцца накірункі іхняй дзейнасці: інфармацыйная падтрымка грамадскіх ініцыятыў, грамадзянская адукацыя ў галіне журналістыкі, развіццё мясцовых супольнасцей і сацыяльнай анімацыі, выданне літаратуры („Песьня пра Зубра", „Легенды і міфы: ад Нёмана да Буга", „Традыцыйная кухня Беласточчыны і Гарадзеншчыны"), развіццё транспамежнага супрацоўніцтва паміж грамадскімі арганізацыямі і ініцыятывамі, умацаванне патэнцыялу грамадскіх ініцыятыў праз навучальныя візіты, трэнінгі, кансультацыі па планаванні дзейнасці арганізацыі і іншае.

Расповед пра сваю работу „трэцясектараўцы" падаюць у рубрыцы „Дзейнасць". Менавіта там даецца падрабязная інфармацыя пра кожны з накірункаў працы, зрэалізаваныя праекты.

Паколькі грамадская дзейнасць гэта перш за ўсё кантакты, то і „Трэцяму сектару" без іх ніяк не абысціся. Аб тым, з якімі арганізацыямі, у тым ліку ў Польшчы, сябруюць гродзенскія грамадскія актывісты, расказваецца на старонцы „Партнёры".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларускія скарбы

Крыж Еўфрасінні Полацкай

Адкрываем сёння новую рубрыку „Беларускія скарбы", у якой будзем гаварыць і разважаць пра разнастайныя нацыянальныя скарбы Беларусі: матэрыяльныя артэфакты, прыродныя аб'екты, культурныя з'явы, архітэктурныя помнікі, духовыя здабыткі Бацькаўшчыны, што ляглі ў залаты фонд нашай гісторыі. Пачаць хочацца з такой вялікай каштоўнасці як крыж Еўфрасінні Полацкай. Хто быў яго стваральнікам? Гістарычныя крыніцы даводзяць, што майстар Лазар Богша. Магчыма рукой яго вадзіў сам Госпад, прынамсі корань прозвішча залатара досыць яскравы. Паводле даследнікаў крыж-шэдэўр быў зроблены ў 1161 годзе для захавання хрысціянскіх рэліквій, якія былі прысланыя Еўфрасінні са старажытных Канстанцінопаля і Іерусаліма.

Шасціканцовы крыж сімвалізаваў пераход ад паганства да хрысціянства. Добра вядома, што знак такой формы азначаў бога Сонца Ярылу. Наколькі такая трансфармацыя была арганічнай? Па тым, што нават у сённяшнім нашым беларускім народным хрысціянстве так шмат язычніцкіх абрадаў і традыцый, можна думаць, што гэта было досыць натуральна. Да ўсяго шасціканцовым быў і так званы патрыяршы крыж.

Крыж, які зрабіў па заказе Еўфрасінні Богша, ад пачатку стаў цудатворным: свяціўся ў непрагляднай цямрэчы, лекаваў хворых, зняверaным і знясіленым вяртаў надзею і сэнс быцця. Каб убачыць гэты цуд у горад над Заходняй Дзвіной пацягнуліся шматлікія паломнікі. Сакрэт крыжа раскрываўся досыць проста — у ім знаходзілася часцінка Хрыстовай крыві з той папярэчыны, на якой быў укрыжаваны Збаўца. А надзвычай цікавая інкрустацыя і багатая аздоба зрабіла яго сапраўдным шэдэўрам ювелірнай справы. У даўжыню крыж меў 51 сантыметр. Да драўлянай асновы на пярэднім і адваротным баках былі прымацаваныя залатыя пласцінкі, каштоўныя камяні, намаляваныя на шкельцах-эмалях выявы святых. А яшчэ рэліквію аздаблялі пазалочаныя срэбныя пласцінкі з надпісамі. Адзін з іх змяшчаў праклён таму, хто наважыцца ўкрасці святыню. Ніхто не ведае, ці дзейсны ён дагэтуль.

Неаднаразова ўнікальны крыж пакідаў сваю радзіму, сабор у Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры, дзе ён захоўваўся, але вяртаўся ў старажытны Полацк. Крыж трапляў у розныя рукі: смаленскіх князёў, маскоўскага валадара Васіля III, праваслаўных, уніятаў, езуітаў, напалеонаўскіх ваякаў. У 1928 годзе Вацлаў Ластоўскі, адшукаўшы крыж у Полацку, перавёз яго ў Мінск. У другую сусветную вайну рэліквія некаторы час знаходзілася ў будынку зямельнага банка ў Магілёве, адкуль загадкава прапала. Версій яе знікнення было некалькі, але ніводная пакуль не пацверджана. Дзе знаходзіцца зараз гэтая беларуская святыня — дагэтуль невядома. Адзін знаёмы мастак неяк паказваў мне ілюстраваны каталог аднаго з расійскіх музеяў. На адной са старонак гэтага выдання была змешчана фота футарала аналагічнай формы.

Крыж Еўфрасінні Полацкай — гэта наша Чаша Грааля. Ніякай, нават дасканалай знешне, копіяй яго не заменіш. Пакуль арыгінал не вернецца на Беларусь, ні дарання, ні любові, ні вольнасці нам не дачакацца. Ёсць падсвядомае перакананне, што гэты хрысціянскі артэфакт менавіта там, на ўсходзе — дзе ў нетрах расійскіх (бяскрайніх і бяздонных) сталічных і правінцыйных сховішчаў, у глыбокіх сутарэннях, вялізнымі гурбамі і стосамі складзены нясвіжскія габелены, любчанскія кнігі, слуцкія паясы, карэліцкія шпалеры і многія іншыя скарбы нашага Вялікага Княства. Калі крыж вернецца на радзіму, беларуская гісторыя пойдзе зусім іншым шляхам.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Пушчанскія кампетэнцыі

Задумалася мне прайсціся ў Пушчу ў пачатках сёлетняга студзеня. Трасу выбраў я непатрабавальную — каля кіламетра між Беглюкамі і Сухадоламі (афіцыйныя назвы гэтых вёсак Minkówka i Suszczy Borek адпаведна). Зараз за першай з іх паказаліся неблагія ямы, вырытыя дзікамі на шашы павятовага рангу ўпрытык з дарожным палатном; змарожаныя груды зямлі валяліся і па прыкрытым снегам насціле...

Крыху далей, ужо ў Пушчы, чарговая цікавінка. Менавіта, над тым жа дарожным палатном павіс байкаваты верх асінавага ствала. Той ствол, якому каля паўметра ў абхвасце, лопнуў ад старасці ў палове сваёй вышыні і яго верх, сілай зямнога прыцяжэння, рвануўся на дарогу. І напэўна на яе паваліўся б, калі б не малады грабчак, у якога голлі ён засеў (на здымку). І вісіць ён цяпер над карыстальнікамі павятовай дарогі быццам Дамоклаў меч, гатовы сваім асінавым калом нейтралізаваць любую нячыстую сілу, якая б выпадкова туды заблудзіла.

Пазваніў я з трывогай у Броўскае надлясніцтва, бо ж і мая душа — як стала нядаўна вядома на гэтых старонках — надта нячыстая, спадзяючыся высвятлення гэтай сітуацыі. Думаў я наіўна, што калі справа кранае дрэў у Пушчы, дык жа менавіта гэтая ўстанова адказная за іх стан. Ляснік на другім канцы тэлефоннага эфіру вывеў мяне на шырэйшыя воды, патлумачыўшы, што справа тут крыху складаная. Бо ж трэба высветліць, на чыім грунце стаіць ствол паламанай асіны і граб-атлант. Сам прыдарожны роў не з'яўляецца межавым паміж тэрыторыяй Пушчы, за якую адказваюць лясныя ўстановы, і дарожнай паласой, за якую адказная дарожная адміністрацыя, а ў выпадку гэтай павятовай дарогі — Павятовае староства ў Гайнаўцы; патрэбная тут фіксацыя геадэзістаў. Праўда, ляснік не спіхнуў гэтай справы за сябе, толькі паабяцаў, што зацікавіць праблемай свае лясныя службы.

Народная пагаворка паведамляе, што чым далей у лес, тым больш дрэў. У разгляданым выпадку шмат дрэў паваленых у выніку прыродных працэсаў. Частка іх ствалоў вісіць на іншых дрэвах, частка не мела такой падтрымкі і легла ў мяккую пасцельку з лясных параснікаў. У нейкіх трыццаці метрах ад дарогі спачыў ствол магутнага ясеня даўжынёй каля дваццаці метраў і абхватам большым за два метры. Падумаць, колькі ў гэтым выпадку высакаякаснай драўніны марнуецца...

І пра гэтую справу пацікавіўся я ў свайго кампетэнтнага размоўцы. Асвядоміў ён мяне, што цяпер нельга забіраць драўніны з Пушчы, бо забараняюць гэтага прыродаахоўныя агенцтвы ў адказ на патрабаванні эколагаў; яшчэ дваццаць гадоў таму леснікі былі акуратнымі гаспадарамі сваіх скарбаў. А гэта абазначае, што незалежна ад таго, пад чыім адміністрацыйным падпарадкаваннем пушчанская тэрыторыя, значыць — не толькі ў распараджэнні нацпарку, нельга з яе кранаць драўніны. Бо ж менавіта ў той драўніне могуць пражываць мікра- ці міні-арганізмы, занесеныя ў каляровыя кнігі сусветных прыродаахоўных фондаў. І яшчэ дадаў адну інфармацыю наконт гэтага канкрэтнага ясеня. Паколькі гэтае дрэва такое магутнае, дык яму можа быць больш за сто гадоў. А такіх лясных ветэранаў, мабыць у знак павагі, нельга кранаць, незалежна ад таго, ці яны трымаюцца вертыкалі, ці ўжо леглі ў наканаваную прыроднымі законамі гарызанталь.

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Генадзя Бураўкіна.



1. валакністы матэрыял для медыцынскіх і тэхнічных мэт = 16 _ 57 _ 56 _ 84 _;
2. мера даўжыні крыху большая за кіламетр = 11 _ 12 _ 3 _ 13 _ 2 _ 1 _;
3. гульня ў пласцінкі з нанесенымі на іх пунктамі = 50 _ 49 _ 46 _ 47 _ 48 _ 59 _;
4. жонка Адама = 79 _ 51 _ 52 _;
5. элемент рота, вілаў, грабель = 55 _ 4 _ 58 _;
6. мера даўжыні, у прынцыпе большая за вярсту = 97 _ 98 _ 95 _ 96 _;
7. мімічны акцёр = 70 _ 69 _ 20 _;
8. тавар Заблоцкага = 89 _ 88 _ 85 _ 86 _;
9. нарачанскі горад = 7 _ 8 _ 65 _ 66 _ 67 _ 68 _;
10. жыхар Гамбурга = 33 _ 34 _ 24 _ 23 _ 81 _;
11. бязвыйгрышны фінал шахматнай гульні = 63 _ 64 _ 75 _;
12. рухомы язык над агнём = 43 _ 15 _ 44 _ 45 _ 31 _ 32 _;
13. дзяржава з Гайнаўкай = 94 _ 76 _ 77 _ 78 _ 74 _73 _ 25 _;
14. горад з Ватыканам = 92 _ 17 _ 18 _;
15. італьянскі адрыятычны порт з... міні = 35 _ 62 _ 61 _ 6 _ 9 _ 90 _;
16. касцяная апора пазваночніка = 87 _ 82 _ 83 _;
17. хуткае труслівае адступленне = 36 _ 41 _ 42 _ 37 _ 40 _;
18. жывёліна, якая прыстасоўвае сваю афарбоўку да колеру акаляючага асяроддзя = 19 _ 38 _ 39 _ 21 _ 22 _ 10 _ 93 _ 14 _;
19. арганічнае рэчыва са знешняга покрыва членістаногіх (*chitinum*) = 54 _ 53_ 80 _ 30 _ 71 _;
20. вялікая звязка, напрыклад, сена альбо саломы = 5 _ 60 _ 91 _;
21. антонім холаду = 29 _ 28 _ 26 _ 27 _ 72 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 51 нумара

Віза, Грэй, павук, пясец, раб, страсць, Убарць, Ціт.

Рашэнне: **Каб развіць сцяг, трэба пайсці супраць ветру.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбалаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

23.01 — 29.01

(22.03. — 20.04.) Можаш узяцца за рэалізацыю самых шалёных ідэй — планета шчасця здыме з тваёй дарогі ўсялякія перашкоды. Будзеш мець падтрымку далейшай сям'і. Перад табою шанцы, якіх не меў за апошнія 12 гадоў! Бярыся за нават, здавалася б, немагчымае!

(21.04. — 21.05.) Да 25.01. будзеш задаволены на працы ці ў школе. Можаш выбрацца ў месцы, якіх дагэтуль не бачыў. Можаш узяцца за вырашанне складаных загадак і таямніц. Калі трапіцца нямогласць, можаш разлічваць на сяброў — хопіць адно слова.

(22.05. — 22.06.) Моцна павялічыцца колькасць тваіх знаёмых, хоць не ўсе табе спадабаюцца. Палюбіш кагосьці з адкрытай галавой і шырокімі кантактамі. Купі гасцінец якраз сабе. Хоць 24-28.01. крэдытную карту пакінь лепш дома.

(23.06. — 23.07.) На працы і ў асабістым жыцці каля цябе будуць моцныя асобы. Сустракайся з сябрамі, асабліва са Скарпіёнам і Рыбамі — іх кампанія дасць табе аддышку і радасць ды зразуменне. Узнагароджанне, прызнанне. Юпітар сыпне грашыма, ды хутка іх можаш расходаваць.

(24.07. — 23.08.) Мілы час у атачэнні блізкіх асоб, таксама і дома. Найахвотней сядзелася б табе ў хаце ў тапачках, ды дайся выцягнуць сябрам з хаты — на пашкадуеш. Будзеш заўзяты да працы і вучобы, ды абавязкова пасля добра адпачні. І не забывайся, што сярод тваіх навагодніх абяцанняў было наведанне лекара!

(24.08. — 23.09.) Не вагайся рабіць сабе прыемнасці — нічога больш табе не трэба як адпачынку і добрага настрою. Больш варушыся, задбай аб фігуру. А твая дыета цяпер павінна быць больш каларыйнай (так!). Сябры задзівяць цябе сваімі рашэннямі, ды яны ведаюць, што робяць. 24-28.01. адчуеш стому; некаторыя справы цябе перарастуць.

(24.09. — 23.10.) Нагоды наладзіць цікавыя кантакты з неардынарнымі людзьмі. Часта выходзь з дому — можаш сустрэць вельмі важныя асобы, якія адыграюць немалую ролю ў тваім жыцці. Схочацца выдаць грошы на навінкі (таксама касметыку) — не шкадуй. У апошнія дні месяца будзь асцярожным; не давярай незнаёмым.

(24.10. — 22.11.) Лёгка пераканаеш іншых да свае рацыі. У пары вернасць перш за ўсё. Не енч, што кашалёк тонкі — лёс сыпане ў апошнюю хвіліну грашом, на які ты ўжо не спадзяваўся. Пануй над эмоцыямі, бо... забаляць жывот ці сэрца. 23-27.01. — праблемы ў падарожжы; правярай білеты не адзін раз.

(23.11. — 22.12.) Народжаным пасля 13.01. уколе ў сэрца зайздрасць. Плануй пакупкі. Будзеш адчуваць недахоп энергіі; больш адпачывай. 25-29.01. пачнеш успамінаць былое каханне; не ідэалізуй мінулага, засяродзься на тым, што будзе.

(23.12. — 20.01.) Ад некаторых планаў прыйдзецца табе адмовіцца. Трэба будзе заняцца справамі, аб якіх ты думаў, што ўжо афармленыя. У новапазнаных асобах будзеш бачыць амаль адны заганы; зможаш папсаваць сваім нараканнем, крытыкай і маруднасцю не адну рамантычную сустрэчу. 24-28.01. магчымыя спрэчкі ў сям'і ці на службе.

(21.01. — 19.02.) Перад табою паявяцца новыя выклікі, адкрыюцца новыя перспектывы, аб якіх ты раней мог толькі марыць. Ідзі смела ўперад! Наладзіш многа цікавых знаёмстваў, многаму навучышся. Настрой паправіць таксама рэгулярны фізічны высілак. Хоць квадратура Урана з планетоідам Вестай можа ўскладніць твае планы і кінуць пару калод пад ногі.

(20.02. — 21.03.) Можа паявіцца ціхі паклоннік, магчымы флірт без абавязкаў. Лепш не выбірайся ў доўгае падарожжа. Мілыя весткі наконт заробку. 28-31.01. можаш адчуць сум і сумненні; не паддавайся! Рыбы народжаныя пасля 10.03. будуць выбуховыя, зменлівасць настрояў, поглядаў і напрамкаў стоміць не толькі іх саміх.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

БЕЛАРУСКАЕ ВАЕННАЕ СТАНОВІШЧА?

Прыняць заклік да неадкладнага і безагаворачнага вызвалення палітвязняў, а нават непрызнання апошніх прэзідэнцкіх выбараў патрабавалі ўдзельнікі канферэнцыі „Ваеннае становішча ў Беларусі? Як да гэтага дайшло і што далей?". Было адзначана прытым, што ў прэзідэнцкіх выбарах 19 снежня, незалежна ад арыштаў у таямнічых акалічнасцях дзеячаў апазіцыі, у тым ліку і кандыдатаў на прэзідэнта, запалохвання іх сем'яў і іншых форм рэпрэсій, у Беларусі дайшло да ўзмацнення адкрытага грамадства і міжчалавечай салідарнасці. Гэтую дэбату ў польскім Сейме асабіста адкрыў яго маршалак Гжэгаж Схетына: „Вітаем дома, у месцы, у якім б'е сэрца польскай дэмакратыі".

Маршалак адзначыў, што сёння дапамога Польшчы для змагаючайся за дэмакратыю Беларусі з'яўляецца абавязкам і яна такая самая па сваім характары з тою, з якой і палякі мелі дачыненне ў васьмідзесятыя гады: з салідарнасцю, падтрымкай, і сэрцам на далоні:

— Ваша змаганне мае тут шмат сяброў і прыхільнікаў. Будзем вас падтрымліваць і рабіць усё, каб ваш голас быў несены далей палякамі. Жадаю вытрымкі і ўпартасці, і таго, каб вы ніколі не здаліся, бо гэта важнае, каб Беларусь была незалежнай часткай адной вялікай супольнай Еўропы.

Шматгадзінную канферэнцыю сарганізавалі Тэлебачанне БелСат, Радыё Рацыя, Фонд „Wolność i Demokracja" ды Студыя Усходняй Еўропы Варшаўскага ўніверсітэта. Была яна падзелена на тры дыскусійныя групы. Не змаглі даехаць на іх Мілана Міхалевіч, жонка палітвязня і былога кандыта на прэзідэнта Алеся Міхалевіча ды Таццяна Севярынец, маці палітвязня Паўла Севярынца, шэфа выбарчага штаба Віталя Рымашэўскага. Абедзве, так як і астатнія госці канферэнцыі, мелі расказаць аб пераследзе і сітуацыі пасля 19 снежня. Засталіся на тэрыторыі Беларусі, бо па дарозе ў Варшаву былі яны спынены КДБ так, каб не паспець. Аднак у выпадку Міланы Міхалевіч яе ліст удалося зачытаць удзельнікам канферэнцыі. Зрабіла гэта жонка Аляксандра Мілінкевіча (прысутнага ў Сейме) Іна Кулей, дзяячка руху за вызваленне палітвязняў у Беларусі. Мілана Міхалевіч адначыла, што 19 снежня ў гісторыі Беларусі стала „чорным днём", а найгоршае тое, што наступіла пасля і што адбываецца далей, гэта пастаяннае запалохванне ды ізаляцыя ад інфармацыі аб тым, што адбываецца з блізкімі.

— Кожны рэжым баіцца свабоднага слова. Непрысутнасць Міланы — доказ таго, што сітуацыя ў Беларусі сур'ёзная, — заявіла мадэратарка першай дыскусійнай групы Агнешка Рамашэўская, кіраўнік Тэлебачання БелСат.

Аб паслявыбарчай сітуацыі распавяла Дар'я Корсак, жонка палітвязня Аляксандра Атрошчанкава, прэс-сакратара былога кандыдата на прэзідэнта Андрэя Саннікава. Расказала, што арыштаваныя маюць праблемы скантактавацца з адвакатамі, якім за абарону палітвязняў пагражае выдварэнне з Адвакацкай палаты:

— Цяпер чакаецца другая хваля рэпрэсій у адносінах м.інш. да студэнтаў. Я ўпэўнена, што вам пад сілу дапамагчы нашым блізкім.

У сваю чаргу Юлія Бандарэнка, дачка палітвязня Дзмітрыя Бандарэнкі, упаўнаважанага Андрэя Саннікава, адзначыла:

— Патрабуем безагаворачнага вызвалення ўсіх палітвязняў і адмовы гандляваць імі.

Алесь Бяляцкі, старшыня Праваабарончага цэнтра „Вясна" звярнуў увагу:

— Еўрасаюз пачаў размаўляць з Лукашэнкам. А мы заўсёды асцерагалі, што калі не будзе структурных змен у заканадаўстве, нічога не зменіцца. Не ўдасца змякчыць рэжыму.

Прытым дадаў:

— У сапраўднасці ніхто не ведае стопрацэнтных вынікаў выбараў.

І яшчэ:

— Мяняецца грамадскі клімат. Цяпер у нас тысячы актывістаў, а мільёны падтрымліваюць нашы дзеянні. На працягу найбліжэйшых гадоў будуць нам вельмі патрэбнымі Радыё Рацыя і Тэлебачанне БелСАт, і за гэты час наступяць змены ў Беларусі.

Уладзімір Колас, дырэктар распушчанага рэжымам Аляксандра Лукашэнкі Гуманітарнага ліцэя, у гэтай частцы канферэнцыі гаварыў:

— Ужо вырасла ў Беларусі пакаленне, якое гаворыць па-свойму, па-беларуску, уздымае бел-чырона-белы сцяг і з-за гэтага яно небяспечнае. Тое, што адбылося ў час выбараў, было нечаканым для ўсіх.

Адзначыў, што цяпер важныя дзеянні ў сферы адукацыі; дапамога для маладых людзей, што выйшлі запратэставаць на вуліцу, і падтрымка незалежных СМІ.

У час працы другой дыскусійнай групы Аляксей Янукевіч, старшыня Партыі Беларускі народны фронт, выказаў перакананне:

— Такіх жорсткіх актаў, як цяпер, ад шаснаццаці гадоў уладарання Лукашэнкі ў Беларусі не было. Цяпер усё залежыць ад дзеянняў Польшчы, Еўрасаюза і свету. Нельга траціць ні хвіліны. Гэты пажар трэба тушыць хутка. Ацэнка падзей павінна быць ясная, з вострым патрабаваннем вызвалення палітвязняў. Эфектыўнымі будуць таксама персанальныя санкцыі, таксама ў адносінах да чыноўнікаў ніжэйшай ступені, напрыклад, дэканаў навучальных устаноў, адказных за адлічэнне студэнтаў за ўдзел у дэманстрацыі 19 снежня.

Аляксандр Мілінкевіч, кандыдат на прэзідэнта ў 2006 годзе, цяпер старшыня Руху „За свабоду":

— Хто найбольш выйграў у гэтых выбарах? Тры разы Расія. Лукашэнка прайграў стасункі з Еўропай, а апазіцыя аслабленая. У гэтых выбарах пачалося вялікае змаганне за будучыню Беларусі і будзе яно працягвацца на працягу найбліжэйшых гадоў. Калі быў пачаты дыялог з Лукашэнкам, забылі пра нас, пра апазіцыю. Мы прайграем змаганне, калі не давядзем сёння да вызвалення палітвязняў. Я заклікаю да яшчэ большай салідарнасці.

Дзмітры Бародка, прадстаўнік Руху „Еўрапейская Беларусь", супрацоўнік Андрэя Саннікава:

— З дыктатарам можна размаўляць толькі тады, калі прапануецца яму капітуляцыя. Іншых варыянтаў не будзе слухаць.

І паўтарыў за іншымі ўдзельнікамі канферэнцыі:

— Не можа быць гандлю вязнямі.

Міхаіл Чыгір з Аб'яднанай грамадзянскай партыі разважаў над увядзеннем эканамічных санкцый у адносінах да Беларусі. На яго думку, гісторыя вучыць, што найчасцей абарочваюцца яны супраць звычайных грамадзян.

— Ці візы для нашых грамадзян павінны быць такія дарагія? — ставіў пытанне.

Некаторыя з удзельнікаў дыскусіі абмяркоўвалі таксама эканамічныя пасляслядоўнасці сітуацыі пасля 19 снежня:

— Эканамічныя санкцыі могуць толькі пагоршыць сітуацыю Беларусі і папхнуць яе да Расіі.

Уладзімір Навасяд з Партыі свабоды і прагрэсу ў сваю чаргу заявіў:

— Слова Еўропа ў Беларусі стала модным.

У час працы трэцяй дыскусійнай групы аб сваіх арганізацыях гаварылі галоўным чынам прадстаўнікі няўрадавых арганізацый, якія дзейнічаюць у карысць Беларусі. Тут Павел Казанэцкі з Усходнееўрапейскага дэмакратычнага цэнтра гаварыў аб неабходнасці „выпрацавання прынцыпаў сапраўднай прагрэсіўнай падтрымкі іншым краінам" і разважаў над канцэпцыяй польскага МЗС аб ажыццяўленні Фонду падтрымкі дэмакратыі.

Яўген Вапа, старшыня Радыё Рацыя, асцерагаў:

— Мусім падтрымліваць беларусаў у Беларусі, а не толькі ствараць сітуацыю, якая заахвочвае іх да выезду. Лукашэнка імкнецца да таго, каб у адзін бок з'ехала як найбольш людзей.

Войцех Бародзіч-Смалінскі з Цэнтра міжнародных адносін:

— Польшча не мае выпрацаваных механізмаў падтрымлівання такіх краін як Беларусь.

У час працы апошняй дыскусійнай групы — з удзелам польскіх дэпутатаў з камісіі замежных спраў — мадэратар Яўген Вапа, спасылаючыся на словы маршалка Гжэгажа Схетыны, што рэзалюцыя па Беларусі, якую мае прыняць Сейм, будзе вельмі вострая, спытаўся, якія заявы павінны ў ёй апынуцца. Дэпутаты ад ГП Анджэй Галіцкі і Роберт Тышкевіч, ад ПіС Адам Ліпінскі і СДПЛ Марэк Бароўскі згодныя з тым, што, мабыць, у рэзалюцыі трэба будзе ўвесці заклік да паўтору выбараў (можа, нават без удзелу Аляксандра Лукашэнкі?), а прынамсі да іх непрызнання.

— Заклік да паўтору выбараў немагчымы для выканання, ды невыключана, што такі запіс павінен там апынуцца, — сказаў дэпутат Тышкевіч.

Дадаў, што аднагалоснаму прыняццю рэзалюцыі трэба надаць высокі ранг, значыць, павінна яно адбывацца ў прысутнасці прадстаўнікоў беларускай апазіцыі.

Марэк Бароўскі:

— Без сумнення, гэтыя выбары не могуць быць прызнаны важнымі.

Тут дэпутат Бароўскі спаслаўся на словы кіраўніка МЗС Радаслава Сікорскага, які адназначна заявіў, што Аляксандр Лукашэнка не выйграў у першым туры.

Абмяркоўваўся таксама погляд, ці Польшча павінна размаўляць аб Беларусі з іншымі краінамі, напрыклад, з Расіяй ці Нямеччынай. Адам Ліпінскі:

— Небяспечнай з'яўляецца канцэпцыя размовы з Расіяй і Нямеччынай аб трэцяй краіне Цэнтральна-Усходняй Еўропы.

Марэк Бароўскі:

— Я прыхільнік размовы з усімі, але гаворка аб Беларусі з расіянамі гэта рызыкоўны бізнес. Можна спытацца ў расіян, чаму прызналі выбары ў Беларусі, але на адказе на пытанне можа кончыцца размова.

Дэпутаты спрабавалі таксама м.інш. адказаць на пытанне, што Польшча можа зрабіць для Беларусі ў час свайго прэзідэнцтва ў ЕС у другой палове года. Адам Ліпінскі:

— Мусім пераконваць, каб праекты такія як Радыё Рацыя, Тэлебачанне БелСат ці Стыпендыяльна праграма імя Кастуся Каліноўскага (дапамога студэнтам адлічаным з беларускіх ВНУ — М. Х.) сталі міжнароднай справай.

Прадстаўнікі партый і арганізацый, якія ўдзельнічалі ў канферэнцыі, прынялі заклік да ўлад РП (парламента, урада, прэзідэнта). Звернута ў ім увага на неабходнасць дапамогі ў вызваленні палітвязняў. Больш м.інш. аб гэтым закліку на стар. 2. У сваю чаргу бурмістр варшаўскага раёна Сьрудмесце Войцех Бартэльскі сімвалічна перадаў прадстаўніку незалежнага сайта „Хартыя'97" ключы да новай сядзібы (у Беларусі сайт быў яе пазбаўлены).

ISSN 0546-1960